ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА АКРУГКОМУ КП(б)Б, АКРВЫКАНКОМУ І АКРПРАФБЮРО.

Рэдакцыя Савецкая, 32. Тэлеф. агульны 72, „ рэдактара 2-65.

Падпісная цана ў месяц 60 кап. Плата за абвесткі: За радок нэтэту . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . 40 кап. Пры шматразовым друкаванні скідка на зводзе.

Год выдання 12-ты. Нумар ў гарадах і акругі 5 кап.

№ 44 || Субота, 22-га лютага 1930 г. || № 44

Выстаўка, прысьвечаная 1-й коннай арміі

У музэі Чырвонай арміі, у 12-ю гадавіну Чырвонай арміі, будзе адчынена выстаўка, прысьвечаная дзесяцігодзьдзю Першай коннай арміі. Спэцыяльны аддзел прысьвечаны палітпрацы Першай коннай. Дыяграмы паказваюць партыйны, сацыяльны і нацыянальны склад байцоў.

Першая конная - інтэрнацыянальная армія. У ёй былі прадстаўлены 20 нацыянальнасьцяў. Цэлыя эскадроны складаліся з вянгерцаў і аўстрыйцаў.

БАЙЦАМ І КАМПАЛІТСКЛАДУ слаўнай Віцебскай падшэфнай дывізіі — у гадавіну Чырвонай арміі — ад працоўных Віцебшчыны ПАЛКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ!

Вартаўніку краіны Саветаў

Н-скай слаўнай дывізіі, застрэльшчыку сацспаборніцтва і ўдарніцтва па баявой і палітычнай падрыхтоўцы і стварэньню кадраў для камаснага будаўніцтва - гарачае прывітаньне.

Надзвычайныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, шпаркія тэмпы індустрыялізацыі краіны і камаснага руху, рашучы наступ на капіталістычныя элемэнты і ліквідацыя кулака, як клясы, узмацнілі нянавісьць і шаленства буржуазіі, белагвардзейшчыны і сацыял-фашыстых да Савецкага Саюзу, небясьпека вайны ўзрастае з кожным днём.

Акругком КП(б)Б упэўнены, што гэрайчная Н-ская дывізія заўсёды будзе стойкім вартаўніком краіны Саветаў, як сацыялістычнай бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту, заўсёды будзе на-чаку, каб даць руйнуючы адпор таму, хто асьмеліцца перашанцуць межы СССР.

Акругком КП(б)Б.

Да новых задач, да новых тэмпаў

Узрастаючая пагроза ваеннага нападу з боку імпэрыялістых на СССР, якая ўзмацняецца, у сувязі з нашым бясспрэчным ростам і праводзімай партыяй палітыкай ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі,— усё гэта ставіць перад Чырвонай арміяй шэраг адказнейшых задач. Гэтыя задачы павінны ў поўнай меры быць вядомы і пралетарыям Віцебшчыны, якія зьяўляюцца шэфамі Н-скай дывізіі.

Першай і асноўнай задачай зьяўляецца максімальнае ўзмацненьне баявой падрыхтоўкі часьцей. Часьці дывізіі маюць шэраг посьпехаў, значныя дасягненьні ў галіне баявой палітычнай падрыхтоўкі, якія нам трэба замацаваць. Толькі на гэтых умовах мы зможам ісьці ўпэўненымі крокамі наперад. Адсюль галоўная для нас задачы—падрыхтаваць высока-кваліфікаванага ў ваенных адносінах і палітычнай пісьменнасьці байца, здольнага са зброяй у руках змагацца за справу сацыялізму.

Як выканаць гэту задану?

Трэба дабіцца ва ўсёй рабоце нашых арганізацый каранного павароту —тварам да баявой падрыхтоўкі. Над гэтай задачай партыйныя арганізацыі, начпалітсклад і чырвонаармейцы працуюць яшчэ з восені мінулага году. Некаторы зрух у гэтым напрамку маецца, але абставіны патрабуюць ня зрухаў, а рашучага пералому ў найкарацейшы тэрмін. Гэтага мы можам дабіцца на падставе сацыялістычнага спаборніцтва, мэтадамі якога павінны працаваць усе арганізацыі і кожны баец у паасобку.

Н-ская дывізія па агульнаму прызнаньню зьяўляецца ін цыятарам у разгортваньні сацспаборніцтва ў Чырвонай арміі. У яе шэрагах узьнікла і разьвілася вядучая форма сацспаборніцтва—ударніцтва.

Зараз дывізія мае некалькі тысяч ударнікаў, дзесяткі ўдарных рот, батарэй, батальёнаў і дывізіёнаў. Усё гэта патрабуе поўнай арганізаванасьці, належнага кіраўніцтва, творчай ініцыятывы мас з тым, каб ваенная і палітычная вывучка байца ўздымалася адпаведным тэмпам.

У сучаснай палітычнай абстаноўцы асабліва значэньне набывае задача клясавага выхаваньня байца, пасьлядоўнае выхаваньне ў духу клясавай непрымірымасьці і пільнасьці. Абстаноўка абвостранай клясавай барацьбы, у сувязі з нашым рашучым наступам на капіталістычныя элемэнты, патрабуе, каб клясавая дбайнасьць байца была рэзка павышана, каб ён пры ўсіх абставінах мог рашуча выступаць супроць кулака і падкулачніка.

Посьпехі суцэльнай калектывізацыі надаюць асабліва значэньне ўдзелу часьцей дывізіі ў калгасным будаўніцтве краіны. Тут перад намі стаяць дзьве задачы. Трэба ўсіх звальняемых восеньню з арміі байцоў зрабіць калгасьнікамі, адначасова падрыхтаваўшы з іх звыш тысячы арганізатараў калгаснага руху. Сур'ёзнай увагі патрабуюць і чырвонаармейскія камуны, створаныя ў мінулым годзе часьцямі гарнізону.

Другая задача—яшчэ больш прыналегчы на ўзмацненьне сувязі дывізіі з шэфам—пралетарыятам Віцебску. Задача ўзмацненьня змычкі часьцей з пралетарскімі арганізацыямі набывае асабліва значэньне ў даннай палітычнай абстаноўцы. Узмацніць пралетарскі ўплыў у чырвонай казарме—гэта вялікая задача. Над гэтай працай павінны ў аднолькавай ступені працаваць як дывізія, так і працоўныя Віцебшчыны.

Шчыльней сувязь з Чырвонай арміяй!

12-ю гадавіну Чырвонай арміі мы сустракаем у абставінах непасрэднай ваеннай небясьпекі. Асноўная супярэчнасьць паміж СССР і буржуазным сьветам, як супярэчнасьць двух працівалеглых сыстэм—сацыялістычнай і капіталістычнай,—выклікаўшая з самага пачатку існаваньня дыктатуры пралетарыяту крыжовы паход міжнароднай буржуазіі, белагвардзейскага атрэн'я і сацыял-здраднікаў з лягеру 2-га інтэрнацыяналу, абумовіўшая штодзённую ўзмацнёную падрыхтоўку да нападу на Савецкі саюз, у апошнія часы, у сувязі з надзвычайнымі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва, посьпехамі па ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну, узмацнёнай індустрыялізацыяй краіны, шырока разгарнуўшагася калгаснага будаўніцтва, і ліквідацыяй кулацтва як клясы,—абярнулася ў шалёную кампанію супроць краіны саветаў.

Падзеі апошніх дзён, як уключэньне Нямеччыны ў супроцьсавецкі блёк, цкаваньне савецкага прадстаўніцтва ў Парыжы, узмацніўшаяся хлусьня і правакацыя з боку буржуазнага друку,—прымушаюць нас быць на-чаку.

Увага, якую мы заўсёды аддавалі нашай гэрайчай Чырвонай арміі, увага да ваенізацыі і ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны,—зараз як ніколі павінна быць павялічана.

Наш абавязак праверыць працу па шэфству над чырвонаармейскімі часткамі, па садружству з імі, выправіць усе недахопы, якія маюцца на гэтым вучастку. Віцебскі пралетарыят шэфствуе над слаўнай Н-скай дывізіяй, якая зьяўляецца **першым застрэльшчыкам у галіне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за лепшае разгортваньне ваеннай вучобы, за падрыхтоўку кадраў для сацыялістычнага земляробства**—штодзень растучых калгасаў і саўгасаў.

Ці ўсё мы зрабілі, як шэфы Н-скай дывізіі?—вось пытаньне да якога павінна быць прыцягнута ўвага ўсіх нашых арганізацый і працоўных мас акругі. Неабходна ліквідаваць маючыяся ў гэтым напрамку недахопы, неабходна **разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж партыйнымі, савецкімі, прафсыяльнымі і гаспадарчымі арганізацыямі за лепшую пастаноўку працы па** шэфству і садружству над часткамі Н-скай дывізіі, а таксама і над тымі часткамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай акругі.

Быць на-чаку, гэтае значыць яшчэ больш замацоўваць сувязь рабочых з Чырвонай арміяй, пралетарскі ўплыў на чырвоныя казармы, каб на падставе гэтага зрабіць Чырвоную армію яшчэ больш баяздольнай, гатовай даць руйнуючы адпор буржуазіі, якая імкнецца сарваць наша пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва.

Баявая падрыхтоўка забясьпечана

Вучоба ў гэтым годзе праходзіць пад знакам скарыстаньня багацейшага вопыту ўсесаюзных манэўраў.

Перш за ўсё была зьвернута ўвага на далейшае ўдасканаленьне начальствуючага складу па пытаньнях кіраўніцтва і складаных форм бою (абход, ахоп, акружэньне).

Такім чынам, у занятках начскладу набывала першараднае значэньне рэгулярнасьць, падрыхтаванасьць, дзякуючы чаму мы маем бясспрэчныя посьпехі, як у акуратным наведваньні заняткаў, гэтак і ў мэтодыцы.

У працы з байцамі, асабліва, вызначаліся посьпехі ў вывучэньні дзейнасьці войск узімку. Сёлета часьці дывізіі здавальняюча забясьпечваюцца неабходнымі прыладамі (лыжы і інш.). Частыя і працяглыя выхады ў полі далі дастатковыя навыкі байцом і начскладу. Наша маршавая траніроўка, у сувязі з гэтым, стаіць на належнай вышыні—павялічылася хуткасьць пераходаў, зьменшылася паўёртасьць ног.

Тактычная падрыхтоўка толькі ў тым выпадку можа быць прызнана пасьпяховай, калі яна мае ўвязку з стралковай падрыхтоўкай,—вось чаму на гэты момант часьці дывізіі зварочвалі асаблівую ўвагу. Новы курс стрэльбаў, якія падрыхтоўваюць меткага, добрага стралка, патрабаваў зьменьняння мэтадаў падрыхтоўкі, пераходу да «актыўнага вывучэньня байца», да работы з дробнакалібернай вінтоўкай, адкінуўшы старыя мэтады (люстэркі, станкі і інш.). Пераход гэты патрабаваў ад усяго начскладу ўпартай і сыстэматычнай работы з боку камскладу. Нягледзячы на ўсе цяжкасьці, мы маем вядомыя посьпехі ў гэтай працы. Актыўны мэтад вывучэньня даў свае станоўчыя вынікі.

Досыць часу было адведзена і на ўзаемадзейнічаньне пяхоты з іншымі родамі войск, асабліва з артылерыяй. І тут нам удалося добра ўвязаць заняткі і даць новы закал байцам. Байцы прызыву 1929 году, дзякуючы новым мэтадам работы, далёка пайшлі наперад, у параўнаньні з прызыўнікамі мінулага году.

Выключнай напруджанасьці ў галіне вучобы ва ўсёй Чырвонай арміі, не жадаючай адставаць у сваіх тэмпах ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, дапамагло і тое сацыялістычнае спаборніцтва, якое мы мелі ў нашых часьцях. Сацспаборніцтва стварае вялікія магчымасьці ў справе баявой падрыхтоўкі і палітвучобы. Вынікі сацспаборніцтва бліскучыя. Мы маем аграмадныя посьпехі, якія выліліся ў выніку нячувалага ўздыму сярод байцоў, актыўна ўдзельнічаўшых у сацспаборніцтве, аб'явіўшых сябе ўдарнікамі.

Моцная палітыка маральнага стаўленьня часьцей дывізіі, энтузіязм байцоў, ударніцтва, якое стала мэтадам нашай працы,—усё гэта спрыяе нашай баявой падрыхтоўцы і стварае ўпэўненасьць, што нашы часьці будуць гатовы для таго, каб даць рашучы адпор імпэрыялістам, імкнучымся да новай вайны.

Ёсьць тэмп, баявая падрыхтоўка забясьпечана.

Камдзіў Тарасаў.

Школе падрыхтоўцы кадраў

Віцебскі Акруговы Выканаўчы Камітэт шчыра вітае сваю падшэфную слаўную Н-скую дывізію.

Чырвоная армія ня толькі надзейны вартаўнік будуючагася сацыялізму, яна лепшая школа па падрыхтоўцы кадраў для нізавога савецкага апарату.

Шырока разгарнуўшыйся камасны рух, узмацніўшаяся ролл саветаў, як воргану дыктатуры пралетарыяту, у сувязі з рашучым наступам на капіталістычныя элемэнты і ліквідацыяй кулацтва, як клясы, патрабуюць новых, стойкіх працаўнікоў для савецкага будаўніцтва.

Слаўная Н-ская дывізія, узмацняючы на падставах сацыялістычнага спаборніцтва сваю баявую магутнасьць, яшчэ больш зьверне ўвагі і на падрыхтоўку стойкіх і палітычна сьвядомых савецкіх будаўнікоў.

Віцебскі Акрвыканком.

Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла ўсе часьці

Сацспаборніцтва ў часьцях Н. дывізіі прыняла вялізарнейшы размах. Да 12-й гадавіны РСЧА не засталося ні воднага байца, які-б ня быў ахоплены дагаворамі сацспаборніцтва. Уся вучоба праходзіць на падставе сацспаборніцтва. Апрача агульна-падкавых умоў, дагаворы заключылі наміж сабой усе роты, узводы і паасобныя байцы, якія перад кожным выхадам у поле, перад кожнай стральбой выклікаюць адзін другога на спаборніцтва. На аснове такога шырокага разьвіцьця сацспаборніцтва чырвонаармейскай масы і начпалітскладу мы за кароткі пэрыяд абучэньня маладых байцоў дабіліся вялікіх посьпехаў.

Напрыклад, мы зараз у цяжкіх зімніх умовах лёгка робім 35—40 кілёмэтравыя пераходы, чаго мы ў мінулым годзе не змаглі дасягнуць. Збор па трывозе замест 30—40 хвілін, робіцца зараз у 20. На пад'ём уходзіць 3 хвіліны, замест ранейшых 5. Вялікае дасягненьне маецца і ў тактычнай падрыхтоўцы байца.

Так, першая рота Н-скага палку ў траскучыя марозы зрабіла самы сапраўдны «ледзяны паход» у 50 кілёмэтраў. Камандаваньне палку ў клопатах аб байцох за 10 кілёмэтраў да канца пераходу пасылае падводы але чырвонаармейцы рашуча адмовіліся ехаць і заявілі: «мы прышлі не ватацца, а трэніравацца ў баявой падрыхтоўцы». Альбо кулямётны ўзвод 7 роты Н-скага палку, які на лыжах цягаў танкавыя кулямёты, і калі прапанавалі паставіць кулямёты на павозкі, дык байцы ўзьнялі хадайніцтва, каб ім дазволілі цягаць кулямёты на сабе. Прысутнічаўшы на занятках камандзір корпусу гэта адзначыў узнагародай камандзіра 1-га ўзводу Н-скага палка Абрамава. Можна было-б прывесьці яшчэ шэраг прыкладаў энтузіязму з тым, каб паказаць, як сацспаборніцтва пераробляе людзей.

Само спаборніцтва пераходзіць на вышэйшыя формы. Вось некаторыя лічбы ўдарніцтва ў часьцях дывізіі. Н-скі полк мае 16 ударных аддзяленняў, 6 узводаў, 3 роты, артдывізіён, палкавую школу і 119 ударнікаў—індывідуальнікаў,—усяго 868 чалавек. Да дню 12-й гадавіны Чырвонай арміі ён будзе мець тысячу. Ці ўзяць Н-скі полк, дзе ўдарніцтвам ахоплена 750 чалавек, артполк—350 і г. д. Толькі ў кавэскадроне яшчэ маецца не ахоплены ударніцтвам 26 чалавек.

Дывізія да дню сьвята Чырвонай арміі прыходзіць з лёзунгам: «даёш новых 2 тысячы ўдарнікаў». Партыйныя і камсамольскія арганізацыі знаходзяцца на чале ўдарніцтва і даюць абавязак поўнасьцю выканаць гэты лёзунг. У Н-скім палку ўся партыйна-камсамольская арганізацыя зьяўляецца ўдарнай. Не адстае і начскладу, які ў двух палкох поўнасьцю аб'явіў сябе ўдарным, пры гэтым трэба адзначыць, што байцы і камсклад ня толькі абвяшчаюць сябе ўдарнікамі, але даюць узорныя прыклады работы. Гэта можна падцьвердзіць парай лічбаў. У Н-скім палку, калі раней стральба давала пападаньне 70 проц., дык зараз яно ўзьнялося да 87 проц. Усвядомасьць па палітзанятках узьнялася да 93—100 проц. Ударнікі заўсёды наперадзе.

Вось першыя вынікі разгортваючагася ў нашых часьцях сацспаборніцтва. Яны сьведчуць, што байцы пад кіраўніцтвам партыі ўсямерна замацоўваюць баяздольнасьць Чырвонай арміі. Пры такім тэмпе работы нам ня страшны вораг і ўсякія спробы зрабіць напад на Савецкі саюз спаткаюць руйнуючы адпор з боку байцоў Н-скай дывізіі. **Ф. Мажаў.**

Садружаства—на належную вышыню!

Чырвоная армія моцна ня толькі сваёй арганізаванасьцю, баявой вывучкай і належнай забясьпечанасьцю тэхнічнымі сродкамі, але і сваёй цеснай сувязьзю з працоўнымі масамі.

Яна—клясавая армія,—армія дыктатуры пралетарыяту.

Шчыра вітаючы слаўны Н-скі полк, акруговае прафсыянальнае бюро заклікае пралетарыят Віцебшчыны ўзмацніць сваю сувязь з чырвоначармейскімі часткамі ў галіне шэфскай працы і садружства, а таксама ўзьняць на належную вышыню працу па ваенізацыі.

Віцебскае акрпрафбюро.

Рота связи о своих достижениях

От отдельных ударников и ударных групп в 1929 году рота связи перешла к ударным отделениям, а **к XII годовщине РККА об'являет себя ударной.**

В выполнении договора соцсоревнования по укреплению боевой подготовки мы имеем ряд достижений: посещаемость политзанятий 95 проц., молодые кр-цы успевают принимать и передавать в минуту 12 слов (телефонограмма), старослужащие —17, прием и передача телеграмм—молодые дают 41 знак в минуту, старослужащие—75, по светосигнальным аппаратам 10 слов. Наводка телефонно-кабельной линии в 5 клм. делается за час. Изготовление по тревоге без имущества делается в 5 мин. Потертость на выходах изжита окончательно, нет также и обмороженных или простуженных. Посещаемость амбулаторим упала до 1 человека в день.

Кроме общих достижений, мы имеем также передовиков в деле связи: Сазонов Николай, Чистов, Латышев, Киселев, Захаренко, Иванченко, Степанов, Антипов, Чепинов, Бенки и Курилко (командир взвода), отд ют все свое свободное время на усовершенствование средств связи. Тов. Курилко изобрел новый коммутатор, которым сейчас рота пользуется на выходах, как наиболее удобным, лыжные установки, флажки и походную кухню на лыжных установках. Комвзвод Быков уделяет много времени делу подготовки будущих младших командиров-связистов. **Рота об'явила себя ударной и по коллективизации.** Уже имеются результаты. Начинают поступать с мест сведения о вступлении членов семей бойцев в колхозы. На агропоходе ротой оборудован ссыпной пункт, скотный сарай на 20 коров, набит ледник для маслобойного завода в колхозе, проведено 15 собраний, коллективизировано 53 хозяйства, собрано семян 49 подвод, дано 2 спектакля, обслужено 2 населенных пункта радиопередвижкой.

В результате проведения месячника сбережений мы заполучили новых 38 вкладчиков с суммой вкладов на 800 рублей, соорганизован ларек для обслуживания кр-цев необходимыми товарами, как на зимних квартирах, так и на походе.

На этих достижениях мы не остановимся и будем, на основе ударничества, и дальше крепить свою боевую подготовку.

Празднуя XII годовщину РККА, рота связи заявляет, что она во всякое время дня и ночи обеспечит связью дивизию, если это понадобится.

Самольянов (Н-я рота связи).

Ударник Пантелеев

В нашей 1-ой ударной роте Н-скою стр. полка активистом ударником является тов. Пантелеев. Для него дороже всего подготовка взвода.

Окончив полковую школу со званием пом. комвзвода, он прилагает все силы, чтобы лучше выполнить свои обязанности. На стрельбе его увидишь возле каждого слабого стрелка и под его руководством даже слабый стрелок полностью выполнит упражнения с превышением нормы. На походе видишь его, оборяющим бойцов. Его стремление—во взводе не должно быть отстающих. О нем писали в „Ильичевке" и многотиражке **Он имеет благодарность за хорошую годготовку взвода.** *Происходит из бедных крестьян, сам батрак. Подал заявление в ВКП(б): „Хочу, говорит, быть ударником коммунистом!"*

М. Фадеев (Н-ский стр. полк).

Готовим кадры для социалистического земледелия

Ноябрьский пленум ЦК ВКП(б) указал на необходимость Красной армии активно участвовать в подготовке кадров организаторов и специалистов для колхозной системы. В постановлении РВС СССР от 30 января это решение пленума ЦК получило свое практическое разрешение.

Задачей Красной армии в вопросах колхозной работы является:

Каждого красноармейца и младшего командира, увольняющегося в долгосрочный отпуск, **сделать колхозником**—во-первых и во-вторых—**подготовить из них специалистов (организаторов, трактористов и пр.) для наших колхозов.** В частях нашей дивизии и полоцкого гарнизона созданы 7 типов курсов, которыми охвачено до 1200 человек. Курсы провели уже по **одному** занятию, которое выявило ряд неполадков с посещаемостью занятий. В данное время приказом по гарнизону устанавливается единый день подготовки колхозников во всех частях и этим будет обеспечена посещаемость курсов.

Работа курсов тормозится недостатком специалистов для преподавания на курсах. Полоцкое ОкрЗУ сумело выделить только несколько специалистов вместо десятка, который нам требуется. Мы вышли из положения, использовав специалистов со средним образованием, имеющихся в команде одногодников в одной из частей.

Помимо гарнизонных курсов в частях формируются курсы по ликвидации агрозоонеграмотности у тех кр-цев и младшего начсостава, которые не охвачены гарнизонными курсами.

Всю работу по подготовке кадра специалистов для колхозов мы проводим за счет свободного у бойцов времени.

Основной задачей Красной армии является—защита пролетарского государства, для чего она должна изо дня в день **повышать свою боевую подготовку.** Поэтому мы так соорганизовали работу курсов и кружков колхозников, чтобы она не только не тормозила боевую подготовку, но наоборот, ее повышала. Мы осуществляем лозунг: **«колхозник—примерный боец РККА».**

Б. Прусс.

Результаты--налицо

Широкая волна соцсоревнования захватила весь наш батальон, благодаря которой в значительной степени повысилась наша боевая подготовка. Заключая индивидуальные договора по соцсоревнованию, бойцы в большей своей массе сами об'явили себя ударниками, чтобы быстрее выполнить взятые на себя обязательства.

Отдельные подразделения—накануне полного перехода на ударничество.

Характерно отметить, что ударничество идет по линии не только укрепления боеспособности, но и по втягиванию своих семейств в колхозы. Это дает нам большую уверенность, что работа бойцов в этой области даст большие практические результаты. Нужно отметить большую активность всего начсостава баталиона, примеру коего следуют и бойцы.

Цифры выполнения по различного рода дисциплинам говорят, что ударники сумели показать себя и на деле, как в бытовой жизни и боевой подготовке, так и в проведении важнейших мероприятий партии.

Котиков (2-й б-н Н-ского полка).

З гэтымі задачамі мы справімся, мы іх выканаем. Працягваючы надалей узмацнёную барацьбу за генэральную лінію партыі, у асаблівасьці супроць правых ухілістых, фактычна дапамагаючых кулацтву, разгортваючы яшчэ сьмялей бальшавіцкую самакрытыку, мы, бясспрэчна, з посьпехам выканаем тыя складанейшыя задачы, якія стаяць перад Чырвонай арміяй.

Начпадзіў **П. Фельдман.**

Ударным темпом

Н-ский ударный полк свои темпы в боевой подготовке перенес и на работу по коллективизации в подшефном сельсовете. Туда регулярно посылаются ремонтные и агитационно-пропагандистские бригады. Вот итог проведенной работы: полностью электрифицирован один колхоз, закрыто 3 церкви и коллективизировано 900 хозяйств.

Вся работа увязывалась с решительным разоблачением кулака. При прибытии на ночевку в Ушачи, кулаки распускали разные контр-революционные слухи. Бойцы дали соответствующий отпор, мобилизовали бедноту, которая потребовала выселения кулаков, занимающихся враждебной агитацией.

Полком об'явлено соревнование между колхозами на лучшее проведение весеннего сева.

Военкор.

Імпэрыялісты шалёна рыхтуюць вайну проці СССР. Антысавецкая траўля ўзмацняецца. Чырвоная армія, будзь на-чаку!

С гордостью вспоминаем пройденный путь

10 лет тому назад в июне 1920 года я прибыл в славную Н-скую стр. дивизию; части занимали оборонительную полосу по реке Березине, оправляясь после первого наступления. Бои показали, что в лице панской Польши, руководимой французскими генералами, Красная армия встретила сильного противника. Но унынию не было места. Босые и голодные бойцы и командиры полка честно выполняли свой долг, и другого желания, кроме движения вперед и уничтожения врага, у бойцов не было.

Такая обстановка для нового человека являлась примером закалки и буквально перерождала людей, готовых штурмующей колонной ринуться на классового врага.

Идя плечо к плечу с этими безстрашными, беззаветными героями--рабочими Урала, с крестьянами Сибири, Вятки и Белоруссии, я чувствовал беззаветный героизм бойцов, командиров и коммунистов, составлявших одно монолитное. Мы, «новички», прибывавшие на укомплектование дивизии, быстро освоивались и шагали нога в ногу.

Так было в годы гражданской войны.

Сейчас, в годы мирной стройки, дивизия занята обучением десятков тысяч рабочих и крестьян военному делу, подготовкой организаторов и строителей социализма, как в городе, так и деревне, и они сейчас в момент окончательной ликвидации остатков капитализма, стоят в первых шеренгах бойцов за социализм.

Один из таких пишет: «Проводил собрание по организации коллектива. Сволочи кулаки подстрелили и ранили в руку, на время, видимо, придется отойти от работы». А ведь таких бойцов, вышедших из рядов дивизии, не одна тысяча.

Так рабочий класс и трудящиеся массы крестьянства нашей страны учатся с оружием в руках защищать страну советов и строить социализм.

С гордостью вспоминаю я сегодня, в день 12-й годовщины Красной армии, пройденный дивизией путь.

Будем через социалистическое соревнование, через ударничество повышать еще больше нашу боевую закалку.

Новиков.

Как мы обманули Колчака

(Воспоминания)

В 1919 году на восточном фронте против Колчака наша 13-я бригада преследовала отступающие части Колчака и проникая в тыл его расположения под селениями Курейно и Мартыновым, напоролась на юнкерские полки в составе целой дивизии. Бой длился два с половиной часа, казаки отрезали наш тыл и мы очутились в кольце.

Мы вынуждены были отступать. Противник не торопился принимать активные меры, надеясь, что с железного мешка нам не выбраться. Белые выставили сторожевые казацкие посты, сами же спокойно расположились по квартирам Отступать мы начали медленно, чтобы не возбудить подозрения у противника. Лошадям по приказу комбрига были завязаны рты, чтобы они не ржали (дело было ночью). Шли почти на носках и разговаривали шопотом. В 5 километрах от места расквартирования казаков, было приказано двигаться к деревне ползком, а обозу остаться в долине. Так мы незаметно подползли к деревне Курейна, окружили ее и с криком «ура» бросились вперед. Казаки от неожиданности бросились врассыпную, оставив все свои пожитки, массу раненых и убитых. Мы спокойно вышли из колчаковского окружения.

Дер. Курейно впоследствии колчаковцами была сожжена по подозрению в том, что нам помогли сельчане, прятавшие, якобы, красных в церкви. Белые не могли допустить мысли, что мы могли вырваться из кольца.

Удачным прорывом мы были обязаны умелому руководству комбрига Сазонтова и героизму бойцов.

Самольянов.

ВЫЗОВ

Младший комсостав 1-й роты Н-ского полка подписался на газету „Боевая подготовка" на 100% и вызывает младший начсостав всех рот полка.

Прафсаюзы, узмацняйце ваенную падрыхтоўку пралетарыяту!

ТЭЛЕГРАМЫ

Бурнае паседжаньне польскага сойму

Выступленьне камдэпутата Жарскага супроць новага закону аб рэкруцкім наборы

ВАРШАВА, 20. У паседжаньні сойму, прыняўшы законапраэкт аб рэкруцкім наборы, адбылося выключна яскравае выступленьне камдэпутата Жарскага.

Заявіўшы, што камфракцыя будзе галасаваць супроць набору, Жарскі заклікаў працоўных да барацьбы супроць падрыхтоўкі нападу на СССР. Ён заклікаў салдацкія масы, у выпадку вайны, пераходзіць на бок Чырвонай арміі,—абаронцы адзінай пралетарскай дзяржавы, і звараціць свае штыкі супроць сваіх-жа камандыраў.

Прамова Жарскага шмат разоў спынялася заувагамі старшыні аб тым, што ён лішыць яго слова, а таксама нячуваным шумам і крыкамі абурэньня на лаўках буржуазных фракцый. Жарскі бросіў пэпэесаўцам абвінавачваньні ў правацыраваньні вайны з СССР. Пэпэесаўцы, пры дапамозе выкліканай варты, сьцягнулі Жарскага з трыбуны і білі яго.

Камдэпутаты Гарон, Росяк і Сыпула абаранялі Жарскага. Дашынскі выключыў Жарскага на 3 паседжаньні. Супроць прапановы Жарскага адхіліць праэкт аб рэкруцкім наборы, галасавалі ўсе партыі, акрамя камфракцыі сельроба і беларускага рабоча-сялянскага клюбу.

Амэрыканскія царкоўнікі вядуць шалёную антысавецкую кампанію

Амэрыканскія царкоўныя арганізацыі ўсіх відаў вядуць шалёную антысавецкую кампанію, падаючы пэтыцыі прэзыдэнту Гуверу, дзяржаўнаму дэпартамэнту (міністэрству замежных спраў, у сэнат і г. п.).

Орган кампартыі «Дэйлі ўоркер» падкрэсьлівае, што пратэсты рэлігійных арганізацый сьведчаць аб падрыхтоўцы імпэрыялістымі вайны супроць Савецкага саюзу, і заклікае пралетарыят да належнага адпору. Таварыства «Прыхільнікаў СССР» склікае на 16 сакавіка масавы мітынг пад лёзунгам абароны СССР.

Барыкадныя баі ў Мадрыдзе

Рабочыя штурмавалі палац караля. Арганізаваны атрады рабочай самаабароны

Як паведамляе «Роте Фанэ», у Мадрыдзе і іншых гарадох Гішпаніі 14-га лютага ў сувязі з дэманстрацыямі беспрацоўных адбываліся сур'ёзныя вулічныя баі. Не зважаючы на забарону дэманстрацый, у Мадрыдзе дэманстравалі тысячы беспрацоўных.

Дэманстранты штурмавалі шэраг фабрык, прычым рабочыя гэтых фабрык кідалі працу і далучаліся да беспрацоўных. Урад абвясьціў у **Мадрыдзе стан аблогі.**

Усе стратэгічныя пункты, грамадзкія памяшканьні і вулічныя скрыжаваньні былі заняты войскамі і узброенымі кулямётамі і ручнымі гранатамі. Шмат дзе дэманстранты прарвалі паліцэйскую варту. З выгукамі «працы і хлеба» тысячы дэманстрантаў накіраваліся да каралеўскага палацу з чырвонымі сьцягамі. Тут **дэманстранты** таксама **прарвалі вайсковую варту.** На спробы дэманстрантаў штурмаваць палац **варта адказала кулямётным агнём.**

Адступіўшы спачатку, **дэманстранты аднавілі штурмаваньне палацу.** Былі **пабудаваны барыкады,** пад прыкрыцьцём якіх дэманстранты абараняліся каменьнямі і ўсім, чым папала. Баі прадаўжаліся да позьняй ночы. Паранена шмат рабочых. 20 паліцэйскіх цяжка паранена.

У рабочых кварталах Мадрыду таксама **ішлі барыкадныя бойкі,** якія ня спыняліся аж да раніцы.

Паведамляюць таксама пра суровыя **бойкі ў правінцыйных гарадох.** У Барсэлёне беспрацоўныя наладзілі галодны паход і **штурмавалі памяшканьне муніцыпалітэту і паліцэйскай управы.** Зруйнавана шмат харчовых крам.

Настрой рабочых надзвычайна ўзьняты. 15 лютага учынен наскок на паліцэйскую варту ў некалькіх мясцох і вызвалена некалькі арыштаваных. Ад раніцы ідзе суровая вулічная бойка. **Большасьць рабочых узброена. Арганізаваны атрад рабочай самаабароны для аховы ўсіх сходаў і дэманстрацый.**

Крызіс ураду ў Францыі

Па паведамленьню агэнцтва Гавас, выканком радыкальнай партыі прыняў рэзалюцыю аб урадавым крызісу. Выканком заяўляе, што радыкалы ня будуць падтрымліваць ніякі урад, які карыстаецца падтрыманьнем правых.

—о—

На фронце клясавай барацьбы

У Афінах (Грэцыя) некалькі сотняў рабочых пад кіраўніцтвам камуністаў з выгукамі „Няхай жыве Савецкі саюз!" дэманстрыравалі перад гарадзкім упраўленьнем, выставіўшы патрабаваньні аб адмаўленьні ад мэтадаў фашысцкага тэрору і задавальненьні патрабаваньні беспрацоўных. Дэманстранты разграмілі канцэлярыю ўправленьня.

— У Ліосісе (Грэцыя) здарыўся ўзрыў складаў вайсковай амуніцыі, пры якім пагібла 10 чалавек. 2 афіцэры і некалькі салдат сьмяротна паранены.

— Прафсаюзнай бюракратыі ўдалося сарваць забастоўку берлінскіх шофэраў таксі.

Обеспечить колхозы и совхозы стальной конницей



Завод «Красный путиловец» в Ленинграде полным темпом развернул работу по выпуску запасных тракторных частей. Завод обещает в этом месяце полностью выполнить задание. Тракторный цех, объявивший себя ударным, должен дать необходимые детали, чтобы к весне тракторы не были в простое.

На снимке: Ударник бригады-коммуны за изготовлением запасных тракторных частей.

Узмацніць падрыхтоўку да пасеўкампаніі ў калгасах

(Пастанова Наркамзему СССР)

Калегія Наркамзему СССР прыняла пастанову аб ходзе падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі. У пастанове гаварыцца:

— Улічваючы, што на 10 лютага з усей рабочай жывёлы гаспадарак, увайшоўшых у калгасы, абагулена 67,7 проц., прапанаваць зямельным і калгасным каапэрацыйным арганізацыям узмацніць работу па абагульненьню рабочай жывёлы. Узмацніць практычную работу па стварэньню ў кожным буйным калгасе ці кусту калгасаў машына-конных, ці зьмешаных трактара-конных станцый. Прапанаваць зямельным і калгасным ворганам дабіцца таго, каб к моманту сева ў кожным калгасе быў упрашчоны рабочы плян. Катэгарычна прапанаваць зямельным і калгасна-каапэрацыйным воргана[illegible] неадкладна скончыць рамонт усіх трактароў.

За выпуск новай пазыкі індустрыялізацыі „пяцігодка ў 4 гады"

(Зварот актыву камсамола Выбаргскага раёну да ўсіх працоўных)

Ідэя арганізацыі асобага фонду абароны краіны сустракала аднадушнае падтрыманьне сярод ленінградзкіх рабочых. Сход актыву КСМ выбаргскага раёну пастанавіў звараціцца да ўраду СССР і да ўсіх працоўных з наступнай адозвай:

— Сход актыву выбаргскай раённай арганізацыі УсеЛКСМ, па ініцыятыве калектываў фабрык «Чырвоны Маяк», „Работніца" і заводу «Чырвоны Кастрычнік», у адказ на шалёныя нападкі імпэрыялістычнай прэсы і капіталістычных арганізацый на Савецкі саюз і іх спробы прадпрыняць крыжовы паход супроць саюзу,—прапануе: прасіць савецкі ўрад абмеркаваць і вырашыць пытаньне аб хутчэйшым выпуску новай пазыкі індустрыялізацыі «Пяцігодка ў 4 гады». У сувязі з гэтым—аб'яднаць усе існуючыя пазыкі ў адзін моцны пралетарскі заем, шляхам абмену аблігацый усіх пазык на аблігацыі новага займу „Пяцігодка у 4 гады".

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Няма дрэнных фабрык, а есьць дрэнныя кіраўнікі

Творчы ўздым рабочых мас не арганізаван на барацьбу за кожную лічбу праграмы

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ТЫХ, ХТО ВІНАВАТЫ Ў НЕВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ

Ліквідаваць прарывы, прыцягнуць да адказнасьці вінаватых

Першы квартал бягучага гаспадарчага году, які зьяўляецца адказьнейшым зьвяном пяцігодкі, даў **недавыкананьне прамфінпляну** амаль па ўсіх прадпрыемствах акругі. Некаторыя з прадпрыемстваў, як ф-ка імя Леккерта, завод „Чырвоны мэталіст", фанэрны завод—**занесены на чорную дошку.** Але і тыя прадпрыемствы, якія выканалі праграму, усё-ж ня далі належных паказацеляй з якаснага боку (адпаведныя дадзены былі прыведзены на-днях у артыкуле т. Пайкіна).

Прарывы 1-га кварталу зьяўляюцца пагрозай пасьпяховаму ажыцьцяўленьню пяцігодкі. Перад намі стаіць задача знайсьці карэньні гэтых прарываў і бязьлітасна вырваць іх, каб у наступныя кварталы ня толькі выканаць прамфінплян цалкам, але і запоўніць прарывы 1-га кварталу.

З боку гаспадарнікаў назіраецца недапушчальная тэндэнцыя—прыкрываць сапраўднае становішча, даваць ня зусім точныя зьвесткі, а таксама ўсю віну звальваць на «аб'ектыўныя умовы».

Бязумоўна, некаторыя перабоі ў галіне забесьпячэньня прадпрыемстваў сырцом былі таксама перабоі і ў адносінах электраэнэргіі. Трэстам і ВСНГБ неабходна падцягнуцца ў галіне абслугоўваньня прадпрыемстваў. Але было-б шкодным і памылковым звальваць усю віну на гэтыя аб'ектыўныя ўмовы.

Арганізацыйная расхлябанасьць, безыніцыятыўнасьць, неўвязка паміж цэхамі і паміж паасобнымі прадпрыемствамі, несвоечасовае складаньне чарцяжоў, непрывядзеньне ў жыцьцё адзінаначальля, недастатковае кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам з боку фабрычна-заводзкіх арганізацый, недастатковы нагляд з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу за працай у цэхах, а месцамі не разгорнутасьць самакрытыкі,—вось галоўныя прычыны недавыкананьня прамфінпляну ў 1-м квартале.

Неабходна канстатаваць, што прамфінплян не прапрацаван як належыць. Ён амаль усюды не даведзен да цэхаў і да рабочых. Рабочыя няўсюды уцямілі, што ад таго, як яны працуюць у варштатаў, залежыць выкананьне прамфінпляну. Шмат якія гаспадарнікі яшчэ да гэтага часу хаваюцца за сьпіной партыйных ці прафсаюзных арганізацый і не ажыцьцяўляюць дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальлі.

Ні ў якім разе нельга прымірэнчаскі аднесьціся да таго разгільдзяйства, якое прывяло да прарываў у прамфінпляне ў 1-м квартале. Неабходна з усёй рашучасьцю вырваць усе «суб'ектыўныя карэньні», **неабходна прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў тых прадпрыемстваў, якія занесены на чорную дошку, а таксама і тых, якія імкнуліся дачай неправільных зьвестак замазаць маючыяся на іх прадпрыемствах недахопы.**

В тупике

Трудколлектив тряпичников в течение последнего года работал на две смены, в которых занято было 750 человек рабочих. Кроме материальной поддержки, как безработным, коллектив вел большую культурно-воспитательную работу. Все цеха объявили себя ударниками, добровольно снизили себе расценки. В течение 6-ти месяцев мы дали 3.000 р. в фонд обороны страны, кроме всего этого мы подготавливаем кадр квалифицированных рабочих для передачи госпромышленности.

Казалось бы, что управление трудколлективами должно было бы уделить особое внимание нашему коллективу, ибо его существование зависит только от регулярного снабжения сырьем и правильного сбыта готовой продукции, но между тем, как снабжение, так и сбыт по сей день не налажены. Если в прошлом году коллектив был обеспечен сырьем на круглый год, то в данное время имеется запас **только на две недели** и перспективы на получение сырья—нет.

Коллектив вырабатывает, в среднем, 120 тонн в месяц и, понятно, что без планового снабжения он существовать не сможет.

Все склады коллектива загружены готовыми изделиями. Характерно, за последний месяц отгружено товаров на 75.000 р., а расходы и заработная плата составляют 135.000 руб., ибо каждый месяц заработная плата с накладными расходами доходит до 40.000 руб. в месяц. У нас простои из-за отсутствия сырья, а в это время на складах Госторгбела лежит без движения до 900 тонн сырья, когда можно было-бы его отдать коллективу для переработки или же обменять сырье на готовый экспортный товар.

Соответствующие организации должны сейчас же заняться вопросом и вывести коллектив из тупика.

Концепольский.

Зьніжаюць расцэнкі

Рабочыя сінічнага аддзяленьня **працкалектыву хэмікаў** тт. Зільбербордт, Сінельнікаў і Левіна зьніжаюць сабе расцэнкі на 11 проц. і павялічваюць норму на 26 проц. Работніцы адэкалонага аддзяленьня зьнізілі расцэнкі па фасоўцы на 10 проц. і павысілі нормы на 16 проц. Работніцы ўксуснага аддзяленьня Палавінская і Салаўёва зьнізілі расцэнкі на 14 проц. і павялічылі норму на 28 проц. Майстар Забораў павялічыў норму па выпрацоўцы крэму для вобуві з 300 дзюжын да 500 дзюжын у дзень.

Рабочыя выклікаюць пасьледваць гэтаму прыкладу працкалектыў люстэршчыкаў.

Соцдоговор рабочих техучастка и мастерских госпароходства

На нашем участке работы по ремонту парового флота уже развернуты и протекают довольно успешно.

Тормозом является лишь то обстоятельство, что недостает некоторых материалов, которые несвоевременно высылаются из управления (Ленинград).

Всего для выполнения судоремонтной программы участка ассигновано управлением 30835 рублей. Процент выполнения ремонта по паровому флоту на 1 февраля колеблется по отдельным единицам от 20 до 28. Срок окончания ремонта — между 15 мая и 1 июня.

С открытием навигации будут производиться землечерпальные работы в проектируемом новом затоне Мазурино, где уже работы проводились в прошлом году. Срок выпуска из ремонта остального флота в большинстве своем приурочивается к 15—20 мая.

Работники мастерских витебского технического участка заключили договор с работниками мастерских госпароходства о своевременном и доброкачественном выполнении судоремонтной программы, о полном изжитии случаев нарушения трудовой дисциплины (опаздывания на работу, преждевременный уход, прогул и т. д.), о бережном отношении к инвентарю и материалам и т. д. Вместе с тем, работники поставили перед администрацией вопрос о необходимости своевременного и полного удовлетворения судоремонтных нужд инструментами и материалами, отсутствие которых отзывается на успехе выполнения взятых обязательств по соцсоревнованию.

Одновременно участком в Велиже производятся работы по новому судостроению, на каковые работы управлением ассигновано 72 тысячи рублей.

Калгасьнікі на заводзе „Чырвоны мэталіст"

Пра сацдагавор запамяталі

Кепска сачыць за ходам сацыялістычнага спаборніцтва прафсаюз і адміністрацыя 6-га і 5-га акалодкаў службы пуці. Сацыялістычны дагавор, заключаны паміж акалодкамі, да апошняга часу не правяраўся. У 6-м акалодку абрана камісія, але яна да працы яшчэ ня прыступіла. Дагаворы не перазаключаліся. Нягледзячы на вялікія размовы аб арганізацыі ўдарных брыгад і ў гэтым напрамку нічога ня зроблена. Арганізоўваліся брыгады самацёкам, ніякага кіраўніцтва імі з боку прафсаюзаў ня было.

Неабходна, нарэшце, абмяняцца вопытам, падвесьці вынікі работы і перазаключыць дагавор, бо з такой працай нельга што-небудзь зрабіць.

Вераломны.

Адзін з лепшых

18 чэрвеня 1929 года **машына-шляхавы атрад Белдартранса** выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва машына-шляхавыя атрады маскоўскага і ўкраінскага аддзелаў. Маскоўскі адгукнуўся і з ім быў заключан дагавор. Атрады абяцаліся зьнізіць сабекошт на 20 проц., палепшыць якасьць, скончыць усе работы замест 1-га кастрычніка—1 верасьня, павялічыць каэфіцыент скарыстаньня машын і г. д. Заключыўшы дагавор, маскоўскі аддзел на гэтым і скончыў усю працу. Да апошняга часу дагаворы не праверазіся і ня гледзячы на ўсе абяцаньні прыслаць сваіх прадстаўнікоў, з Масквы ніхто ня прыехаў.

З украінскім аддзяленьням атрымалася яшчэ горш. На выклік украінцы адгукнуліся толькі ў верасьні і калі віцебскі паслаў копію дагавора з маскоўскім аддзелам з прапановай далучыцца да яго, дык аддзел зусім смоўк.

Ня гледзячы на гэта, віцебскі атрад дагавор спаборніцтва праводзіць у жыцьцё і выканаў яго поўнасьцю. Рабочая брыгада, якая займалася праверкай, выявіла цэлы шэраг дасягненьняў.

Зьніжан сабекошт на 21,7 проц., палепшана якасьць на 45 проц., каэфіцыент карыстаньня машын даведзен да 87,15 проц., процант прагулаў зьнізіўся да 0,5 проц.

Усе работы скончаны раней тэрміна, плян выканан на 155 проц.

Абагульваючы усё гэта, бачна, што Беларускае аддзяленьне мае дасягненьні і дагавор спаборніцтва выкананы поўнасьцю. Можна быць упэўненым, што і далей гэты тэмп ня будзе зьменшан.

Батура.

Прывітаньне ЦВК Беларусі ЦВК Узьбекскай ССР

Прэзыдыум ЦВК Беларусі ад імя пралетарыяту і працоўнага сялянства горача вітае рабочых і працоўнае сялянства братняй Узьбекскай ССР з пяцігодзьдзем яе існаваньня і будаўніцтва сацыялізму пад кіраўніцтвам ленінскай кампартыі.

Ажыцьцяўляючы на тэрыторыі Узьбекскай ССР заветы У. І. Леніна ў галіне клясавай і нацыянальнай палітыкі сярод вызваленых Кастрычніка-вай рэвалюцыяй працоўных мас і народаў Усходу, Узьбекская ССР, як частка Саюзу ССР, зьяўляецца моцным аплотам яго на ўсходнім рубяжы і найлепшым доказам правільнасьці клясавай і нацыянальнай палітыкі савецкай улады.

Прэзыдыум ЦВК Беларускай ССР у дзень пяцігодзьдзя Узьбекскай ССР жадае ёй далепшых посьпехаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі шляхам індустрыялізацыі і калектывізацыі, паказваючы гэтым працоўным масам тых народаў Усходу, якія яшчэ знаходзяцца ў абцугох клясавага і нацыянальнага прыгнечаньня—Ленінскі шлях да сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

Старшыня ЦВК БССР **А. Чарвякоў.**

Ультыматум нанкінскага ўраду Ен Сі-шану

Нанкінскім ўрадам адпраўлены ультыматум Ен Сі-шану, у якім патрабуецца: 1) узяць назад патрабаваньне аб адстаўцы, 2) вызваліць Фын Юй-сяна і паклапаціцца аб яго ад'езьдзе за граніцу і 3) правесьці скарачэньне шансійскіх войск.

Мукдэн і СССР

Як паведамляюць з Харбіну, **расфарміраваньне адазваных з савецкага фронту мукдэнскіх войск прыпынена.**

— Па паведамленьню з Харбіну, **захопленыя кітайцамі ў пэрыяд канфлікта бібліатэкі чыгуначных сходаў** на станцыях Кіт.-Усх. чыгункі, **звярочваюцца** ранейшым уласьнікам—**чыгуначным сходам.**

—о—

Знойдзен труп Эйельсона

Са шхуны «Нанук» паведамляюць, што труп Эйельсона знойдзены ў 200 футах ад абломкаў аэраплянy. Труп быў знойдзен групай, на чале якой знаходзіцца савецкі лётнік Сьляпнёў. Трупы Эйельсона і Борланда знаходзяцца на самалёце Сьляпнёва і будуць дастаўлены на «Нанук», як толькі дазволіць пагода.

Дабіцца пералому ў галіне разьвіцьця ашчадсправы

(Пастанова сходу гарадзкога партактыву і прафактыву)

Заслухаўшы даклад т. Пайкіна аб фінансавых мерапрыемствах і месячніку ашчаднасьці, нарада партыйнага і прафэсыянальнага актыву і камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе адзначае:

а) Напружанасьць нашых народна-гаспадарчых плянаў высоўвае неабходнасьць максімальнага скарыстаньня ўсіх маючыхся ў краіне сродкаў, для забесьпячэньня фінансавымі рэсурсамі намечаных па кантрольных лічбах мерапрыемстваў.

б) Побач з рашучай барацьбой за сапраўдны рэжым эканоміі ў нашым гаспадарчым будаўніцтве, мабілізацыяй сродкаў унутры нашае гаспадаркі набывае асабліва важнае значэньне акумуляцыя ў рэчышча дзяржкрэдыту вольных сродкаў і дробных зьберажэньняў працоўнага насельніцтва.

Гэтая важная задача, ускладзеная на нашу сыстэму ўнутранага дзяржаўнага крэдыту, якая ажыцьцяўляе зьберажэньне вольных сродкаў праз дзяржаўныя пазыкі і ашчадныя касы,—да гэтага часу выконваецца слаба.

Асабліва нездавальняюча разьвіваецца ашчадная справа, якая зьяўляецца ў сучасны момант адным з найбольш адсталых вучасткаў нашае працы.

в) Месячнік зьберажэньньняў, які ставіць сваёй асноўнай мэтай—дабіцца пералому ў галіне разьвіцьця ашчаднай справы і прывядзеньне тэмпу яе росту ў адпаведнасьць з маючыміся эканамічнымі магчымасьцямі ў Віцебскай акрузе разгортваецца недапушчальна слаба.

На 1-е лютага кантрольныя лічбы па ашчадсправе на 29—30 г. выкананы па ўкладах на 3 проц. і па ўкладчыках—на 3 проц. Такое катастрафічнае становішча ашчадсправы пагражае зрывам месячніку зьберажэньняў і выкананьня кантрольных лічбаў.

г) Асноўнай прычынай такога нездавальняючага становішча зьяўляецца недаацэнка мясцовай грамадзкасьцю палітычнага значэньня кампаніі і недастатковая актыўнасьць ашчаднага апарату. Большасьць грамадзкіх арганізацый абмежавалася дачай дырэктыў, не арганізаваўшы нагляд за іх выкананьнем.

Вельмі слабую дзейнасьць праяўляюць камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе.

У мэтах узмацненьня мабілізацыі вольных сродкаў працоўных і забесьпячэньня пасьпяховага правядзеньня «месячніка», нарада лічыць неабходным:

1. Неадкладна разгарнуць шырокую растлумачальную працу па месячніку ва ўсіх калектывах рабочых і служачых.

2. Паставіць пытаньне аб «месячніку» на абгаварэньне агульных сходаў рабочых, увязаўшы яго з нашымі чарговымі гаспадарчымі задачамі.

3. Неадкладна арганізаваць праверку выкананьня дадзеных па лініі партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў дырэктыў па месячніку, праз рабочыя брыгады і «лёгкую кавалерыю».

Прасіць акрпрафбюро, вылучыць адпаведную колькасьць брыгад для гэтай мэты.

4. Даручыць акруговай ашчадкасе і гарадзкой камісіі садзейнічаньня ўзмацніць сваю працу і кіраваньне месячнікам, арганізаваўшы жывую сувязь і інструктаж нізавых камісій садзейнічаньня і грамадзкіх арганізацый.

5. Пры правядзеньні агітацыйна-растлумачальнай працы па месячніку зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкрыцьцё агітацыі кулацка-нэпманскіх элемэнтаў супроць савецкіх ашчадкас, у корані прасякаючы ўсе такія факты.

6. Шырока практыкаваць сацспаборніцтва паміж паасобнымі ўстановамі, цэхамі і вярбоўшчыкамі.

7. Шырока скарыстаць для папулярызацыі месячніка акруговую газэту і мясцовыя друкаваныя і насьценныя газэты, бічуючы ў іх усе факты нядбайных і безадказных адносін да кампаніі.

8. Даручыць камісіі садзейнічаньня ўвязаць растлумачальную працу па месячніку з утрыманьнем на руках у працоўных раней выпушчаных дзяржаўных пазык, у прыватнасьці 2-й пазыкі індустрыялізацыі. Улічваючы вельмі слабое разгортваньне кампаніі на вёсцы, узмацніць жывое кіраўніцтва працай мясцовых ашчадкас і грамадзкіх арганізацый, паслаўшы ў шэраг раёнаў спэцыяльныя рабочыя брыгады, а ў астатніх раёнах—скарыстаць для гэтай мэты выехаўшыя на вёску для правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі, рабочыя брыгады і паасобных працаўнікоў.

9. Лічучы, што безнаяўныя разьлікі зьяўляюцца адным з важных момантаў умацаваньня савецкай фінансавай сыстэмы, папулярызаваць шырока сярод усіх працоўных значэньне і сутнасьць безнаяўных разьлікаў па масавых плацяжах насельніцтва праз ашчадкасы.

Полностью выполнить контрольные задания по месячнику

(Из приветствия московской рабочей бригады партпрофактива и комиссиям содействия по госкредиту г. Витебска)

Московская рабочая бригада электрозавода «ГЭТ», командированная в Белоруссию, по вопросам «месячника сбережения», приветствует вас, товарищи, от $7\frac{1}{2}$ тысяч организованных пролетариев—металлистов нашего завода.

Бригада за 12 дней своего пребывания в Белоруссии, уже успела установить, что важнейшая для государственного кредита ударная кампания «месячника сбережения» осуществляется у вас совершенно неудовлетворительно.

Главнейшим недочетом является почти полная бездеятельность общественности. Формальное отношение профорганизаций к кампании срывает сберегательное дело. В свою очередь с л а б ы й и несовершенный сберегательный аппарат, частично засоренный классово-чуждыми элементами и мало-квалифицированными работниками, не смог один раскачаться, чтобы пустить в ход должным темпом и в широком масштабе эту кампанию.

Мы побывали на предприятиях г. Витебска и определенно установили, что подавляющее большинство партийных и профессиональных организаций, даже не ставили у себя вопроса о «месячнике сбережений».

Рабочая бригада, уезжая сегодня дальше по территории БССР, выражает свою глубокую уверенность, что вашими об'единенными усилиями, кампания не только будет развернута и пройдет под знаком исключительного вашего к ней внимания, но и даст в результате стопроцентное выполнение контрольных заданий по «месячнику».

Товарищи! Все как один на повседневную практическую работу по собиранию средств на индустриализацию. Пусть вашим лозунгом явятся: «К концу «месячника сбережений» ни одного трудящегося Витебщины, не вкладчика сберкассы!»

Увесь бюджэт—праз ашчадкасы

Супрацоўнікі **2-га аддзяленьня міліцыі,** заслухаўшы даклад аб месячніку зьберажэньняў, вынесьлі пастанову, каб увесь свой бюджэт праводзіць праз ашчадкасу. Пасьля сходу, некаторыя прысутныя адразу-ж унесьлі свае грошы на ашчадную кніжку.

Усім уступіць у зьберкасы

Хатнія гаспадыні **жакт'у № 9** на агульным сходзе аднагалосна вынесьлі рашэньне прыняць актыўны удзел у правядзеньні месячніку ашчаднасьці і усім уступіць укладчыкамі зьберкасы. Жанчыны выклікаюць на сацыялістычнае спаборніцтва жакт № 10

Лісток Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі

ЛЕЖАБОКІ ЗРЫВАЮЦЬ ПЛЯНЫ

НА БАЯВЫХ ВУЧАСТКАХ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЁСЬЦЬ ПРАРЫВЫ

ПА БАЛЬШАВІЦКУ ВЫКАРЫСТАЦЬ КОЖНУЮ ХВІЛІНУ

Ніякіх адсрочак і прамядленьняў.— Ніякіх апраўданьняў адстаўшым!

ВЫГНАЦЬ КУЛАКОЎ З КАЛГАСАЎ

Як падрыхтаваліся акруговыя ўстановы

Работа акруговых устаноў у сучасны момант павінна быць прасякнута моманамі падрыхтоўкі да вясеньняй насеўнай кампаніі, яна павінна забяспечваць шпарле разьвіцьцё усё ўзрастаючага калгаснага руху, яна павінна спрыяць хутчэйшай перабудове вёскі на сацыялістычных пачатках. Нашы рабочыя клюбы таксама павінны ў сваёй штодзённай рабоце заўсёды завастраць пытаньні калектывізацыі, падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Якое ажыцьцяўленьне атрымалі ўсе гэтыя задачы на справе, паказваюць матэрыялы рабкораўскіх брыгад, якія вытварылі шэраг «налётаў» на ўстановы і клюбы.

Дапушчаны буйныя прарывы

Вось матэрыял «налёту» на **Акрсельсаюз**, вытворанага брыгадай у складзе тт. **Хацкіна і Камінскага**. З гэтага матэрыялу мы бачым, што акрсельсаюз да гэтага часу на падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы глядзеў скрозь пальцы. Нягледзячы на тое, што заключэньне дагавораў па кантрактацыі пасеву павінна скончыцца к 1-му сакавіка, плян да гэтага часу ня выкананы ні на адзін процант. У раёны ілляны пасланы з спазьненьнем. Апрача зробленага аднаго напамінку, ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў ня прымалася. Плянам і дырэктывам, папаўшым у сельсаюз, наогул, цяжка выбрацца з папяровых пушчаў, не праляжаўшы досыць салідны тэрмін. Так, **плян кантрактацыі нарыплодаў быў атрыманы ад Белпаляводсаюзу 23 га студзеня, а ў раёны пасланы толькі 11 лютага. Зусім дрэнна ідзе збор занантрактаванага насеньня. Сельгаставарыствы бязьдзеймічаюць. Беліцкае таварыства, напрыклад, выканаля толькі 7,5 проц. заданьня.**

Становішча з забесьпячэньнем калгасаў сельгасінвэнтаром зусім нездавальняючае. **На 10-га лютага плян выкананы на 22 проц.** Заданьне па забесьпячэньню калгасаў насеньнем таксама выконваецца дрэнна. **Па канюшыне выканана 14,2 проц., віні—9 проц., а па каранеплодам і канаплі—ніводнага процанту.** Замест патрэбных на акругу 40 тонн капусты і гуркоў для акругі выдзелена толькі 2—3 тонны.

Процант выкананьня пляну па завозу ўгнаеньня на 10 лютага складае 14,5. На ачыстку насеньня ня зьвернута належная ўвага. Першыя часы машыны былі не нагружаны, а цяпер у іх адчуваецца вялікі недахоп. Нягледзячы на тое, што ачыстка павінна быць закончанай да 20 студзеня, мы на 10 лютага маем толькі 60 проц. ачышчанага збожжа.

Калгасы не абслугоўвалі

Брыгаднікі **Алееў, Белахвостава** і **Жур** у **Акрмалжыўсаюзе** знайшлі цікавы плян, у якім прадугледжваецца абслугоўваньне выключна малочных таварыстваў, а аб калгасах—ні слова. Кантрактацыя малака праведзена толькі ў Віцебскім і Лёзьненскім раёнах. Тры дні таму назад макуха і высеўкі даваліся выключна таварыствам, і толькі нядаўна зроблена распараджэньне аб выдачы іх калгасам. Замест вызначаных па пляну для загатоўкі 3360 штук таварнай жывёлы, загатоўлена толькі 614. Не закуплена ніводнага каня і з патрэбных на гэтую мэту 100 тысяч рублёў, сельгасбанк адпусьціў толькі 10 тысяч. На 1-е лютага заканктрактавана 129 галоў буйнай рагатай жывёлы, тады калі па пляну намечана 7200 галоў.

Дрэнна з загатоўкамі

Брыгада ў складзе **Буянова** і **Маргунова**, рабіўшая «налёт» на спажыўсаюз, паведамляе, што загатоўка пасеўнага матэрыялу праходзіць здавальняюча. Так, па збожжавых культурах плян выкананы на 108,6 проц.

Да гэтага часу ўдзельная вага таварнай масы па забесьпячэньню калгасаў у першым квартале дала 25 проц. агульных звароткаў прамтавараў, у другім квартале яна складае 33 проц.

У верасьні праводзілася кампанія па збору другаснай сыравіны, але зараз на гэта не зварочваецца належная ўвага, і процант выкананьня пляну ў гэтай галіне вельмі нязначны. Па жалезнаму лому, напрыклад,—5,2 проц., па касьцях—11,8.

Фонды каапэраваньня на 1-е кастрычніка 1929 г. былі амаль поўнасьцю скарыстаны.

Некаторыя раённыя таварыствы ўсё-ж вельмі дрэнна спраўляюцца з загатоўкамі. Сюды трэба аднесьці: **шумілінскае, яное замест 900 цэнтнераў ільну, загатовіла толькі 61 цэнтнер,** і **межынскае—замест 259 184 цэнтнеры.**

У рабоце маючайся пры спажыўсаюзе кніжнай базы адчуваюцца перабоі і наогул база не здавальняе запыту на літаратуру, які прад'яўляе вёска на сёньняшні дзень. Асабліва патрэбна літаратура па калгаснаму руху і агранамічная.

У акрвыканкоме

Быў «налёт» і на **інспэктарыяты акрвыканкому.** Брыгада ў складзе **Азерніпавай, Дзегцярова, Марфіна** і інш., выявіла шэраг станоўных бакоў у рабоце інспэктарыяту жывёлагадоўлі. Усё-ж інспэктару неабходна ў далейшым зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на ўбой рагатай жывёлы, часьцей выяжджаць у раёны, даючы практычныя парады для выпраўленьня маючыхся недахопаў. Неабходна палепшыць абслугоўваньне злучных пунктаў.

Інспэктарыяту паляводзтва трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на ачыстку насеньня і загатоўку мінэральнага ўгнаеньня. Збор попелу яшчэ вытвараецца няўсюдым.

Інспэктарыят земляробства ня мае зьвестак аб праведзенай у раёнах рабоце па вемляўпарадкаванньню, сувязь з раёнамі не наладжана. Таксама і часьцей трэба выяжджаць у раёны.

Мясцоваму Аркрвыканкому ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі прыймае недастатковы ўдзел. У раёны для работы паслана ўсяго толькі 2 таварышы.

За попелам няма нагляду

З матэрыялаў «налёту», вытворанага на **віцебскі вузел МББ чыг.**, відаць, што ні мясцоком, ні ячэйкі—ня маюць сваіх пляноў падрыхтоўчай работы да сяўбы. Паслаць таварышы на работу ў калгасах, частка з іх—тэрмінам на год. Пры ФЗУ маюцца майстэрні па рамонту сельгасінвэнтара. Пры майстэрні цягі арганізавана брыгада, якая робіць 15 плугоў, працуючы ў выхадныя дні.

Робяцца адлічэньні і праводзіцца збор сродкаў на дапамогу пасеўнай кампаніі і на закупку трактара. Збор попелу яшчэ ня ўсюды праходзіць здавальняюча. Так, на таварным двары стаяць дрыўляныя скрыні, тады, калі там неабходны жалезны. **Агульная сырыня стаіць пад адкрытым небам, попел псуецца.**

Кніга да вёскі не даходзіць

Які ўдзел у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі прыймае алдзяленьне **Белдзяржвыдавецтва**, выяўляла брыгада ў складзе **Анціпава** і **Харошка**. На складзе і ў магазыне зараз маецца літаратуры па сельскай гаспадарцы і калектывізацыі — каля 7000 экз., але **спэцыяльнай літаратуры па вясеньняй пасеўкампаніі 1930 г зусім няма.** Няма таксама спэцыяльнай літаратуры аб клясавай барацьбе ў вёсцы. Зусім няма кніжак аб пяцігодцы калгаснага будаўніцтва.

Ня зусім добра абстаіць справа з распаўсюджваньнем літаратуры. Толькі 14 лютага арганізаваны кіёск пры «Доме селяніна». Аб распаўсюджаньні кніжак кніганошамі 2-га РК КСМ зьвестак няма. З боку ЦРК, спажыўсаюзу, культэмычкі—запытаньняў на літаратуру па пасеўнай кампаніі ня было.

Цікавыя адносіны да беларускай літаратуры наглядаюцца ў кіёску пры Палацы працы. Калі знаходзілі літаратуру па адпаному пытаньню на беларускай і расійскай мове, дык бралі толькі расійскую а беларускую зварочвалі назад, кажучы, што «мы знайшлі на расійскай мове, пагэтаму на беларускай нам непатрэбна».

Прасоўваць кнігу ў калгасы немагчыма, бо там няма гандлюючай сеткі БДВ.

Наогул, кнігагандлюючыя арганізацыі не зварочваюць патрэбнай увагі на пасеўную кампанію і ня ставяць перад сабою задачы скарэйшага прасоўваньня кнігі ў вёску.

Ахвяравалі 47 руб. і даволі...

Брыгадамі таксама былі вытвараны «налёты» на шэраг гарадзкіх клюбаў, у рабоце якіх выяўлены значныя хібы. Брыгаднікі **Дэйнаровіч** і **Леўшанна**, рабіўшыя налёт на **клюб імя «Парыскай Камуны»**, спаткаліся там з такім становішчам. Калектывізацыя вёскі зусім ня цікавіць клюб. Не праведзена ніводнага дакладу на гэтаму пытаньню, няма лёзунгаў. Уся работа клюбу па пасеўнай кампаніі выказалася ў тым, што прайленьне закупіла для вёскі на 47 руб. літаратуры, у плян клюбнай работы на люты ўключана толькі адна лекцыя па пасеўнай кампаніі. Закупленая некалі для чытальні сялянская літаратура ляжыць пад спудам у бібліятэцы.

У клюбе маецца 15 печак, а попелу сабрана толькі палова маленькай бочкі, астатні ідзе на вецер.

Тэмпы работы клюбу адстаюць ад важнейшых палітычных мерапрыемстваў партыі па калектывізацыі і пасеўнай кампаніі. Праўленьне спробуе апраўдаць сваю бязьдзейнасьць заняцьцем клюбу пад сходы па чыстцы партыі і позьнім атрыманьнем ад АПБ інструкцый, якія прысланы толькі 10-га лютага.

„Мне зараз не да гэтага..."

Ня лепш справа і ў **клюбе шавяўнікаў**, які ня так даўно пачаў сваю работу. На пытаньне брыгадніка **Жытэльзэйфа**, што зроблена па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, загадчык клюбу адказаў:

— Мне зараз не да гэтага, чыстка партыі адарвала ад работы. Клюб заўсёды заняты пад агульна-гарадзкія сходы, а пагэтаму культмасавай работы ў нас няма і ня будзе.

Пры клюбе ёсьць бібліятэка, але яна зачынена з 1-га лютага. Загадчык ня ведае, ці ёсьць там літаратура па калектывізацыі, кнігі закупаюцца без яго ведама. У чырвоных куткох пуста.

Клюб шавяўнікаў павінен перабудаваць сваю работу, прыстасаваць яе да абслугоўваньня членаў прафсаюзаў. Трэба выпрацаваць канкрэтны плян далейшай работы, уключыўшы ў яго пытаньні пасеўкампаніі.

І тут ня зусім здавальняюча

А вось, што знайшлі ў **клюбе будаўнікоў** брыгаднік **Хейфац** і **Цытовіч**.

У бібліятэцы ёсьць толькі 2 брашуры аб вясеньняй пасеўнай кампаніі.

20 кніжак аддадзена адʼяжджаючым у вёску. Выстаўкі пяцігодкі калгасаў няма. Дыяграмы і плякаты аб вясеньняй сяўбе і калгасах таксама адсутнічаюць.

Наладжаны вечар фізкультурнікаў на карысьць пасеўнай кампаніі, было некалькі гутарак з членамі гуркоў, наладжана выстаўка кніг па калектывізацыі. Але ўсё-ж работу клюбу гэтым напрамку нельга назваць здавальняючай.

Што рабілі чыгуначнікі

Тт. **Анціпаў** і **Калінін**, рабіўшыя «налёт» на **клюб «Суботнік»**, паведамляюць, што клюбам праведзены два сходы, на якіх прысутнічала 750 чалавек, зьбіраюцца сродкі праз выклікі. Харавы гурток выклікаў на спаборніцтва драмгурток на збор кожным гуркоўцам 6 кілёграм попелу. Гурток фізкультуры зрабіў вылазку ў падшэфны Межынскі раён, з мэтай праверыць ход ачысткі насеньня, арганізаваць фізкультурныя гуркі.

Лекцый, гутарак, вечароў пытаньняў і адказаў і пастановак на тэму аб пасеўкампаніі і калектывізацыі—ня было. **У бібліятэцы маецца толькі 20 брашур аб пасеўкампаніі.** Выставак, плякатаў і дыяграм няма. Сярод сем'яў рабочых тлумачыльні не праводзіліся.

Зусім бязьдзейнічалі

Нягледзячы на тое, што ў **клюбе мэдсанпрацы** маюцца магчымасьці для правядзеньня работы па пасеўкампаніі (спэцыялісты, памяшканьне, бібліятэка), клюб гэты прадстаўляе сабою ўзор пасыўнасьці, якая мяжуе з апалітычнасьцю. Плякатаў і лёзунгаў няма. Усякая работа па пытаньнях калектывізацыі адсутнічае. Бібліятэка недастаткова забясьпечана літаратурай і нядзіва, што на апошнім пасяджэньні праўленьня саюзу было пастаноўлена перааабраць праўленьне клюбу за бязьдзейнасьць. Аб гэтым паведамляюць брыгадзікі: **Барнан, Перцаў** і **Гімзбург.**

***

Вось тое становішча, у якім знаходзіцца работа па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі ў нашых установах і клюбах. З вышэйпаданых матэрыялаў відаць, што акруговыя ўстановы ня ўсе яшчэ падрыхтаваліся да сяўбы. У іх рабоце наглядаецца шэраг зрываў, недахопаў і хібаў, якія павінны быць зараз-жа выпраўлены. Становішча ў клюбах прымушае зараз-жа паставіць пытаньне аб неадкладнай перабудове іх работы ў сэнсе прыстасаваньня яе да задач пасеўкампаніі і калектывізацыі.

Што робіцца ў раёнах

Адстаюць ад калгаснаха руху

Работа ў **Сураскім** раёне праходзіць бяз пляну. Да суцэльнай калектывізацыі была вызначана чатыры сельсаветы, на справе-ж калектывізацыя гэтая праходзіць па ўсяму раёну, і такім чынам работа райвыканкому і сельсавету адстае ад калгаснага руху.

Абагульваньне насеньня ў калгасах праходзіць толькі за кошт аўса, астатнія культуры не абагульваюцца. Пытаньне гэтае сярод калгаснікаў не атрымала дастатковага высьвятленьня.

Арганізаваныя некалі дзьве кавальскіх майстэрні не працуюць і сродкі, адпушчаныя для іх, не скарыстаны. Зусім недастаткова праводзіцца барацьба з тайным забоем жывёлы і разбазарваньнем. Міліцыя не рэагуе на заметкі ў насьценгазэтах. Збор попелу і другараднай сыравіны праходзіць слаба. Нагляду за зборам няма. Сродкі на трактарную калёну не паступаюць.

Брыгаднікі **Баганаў** і **Яшкін**, быўшыя ў гэтым раёне, адзначаюць актыўны ўдзел настаўніцтва ў калектывізацыі. Толькі адны настаўнікі **Стара-Батаніцкага** сельсавету ня хочуць працаваць. Рабочай брыгадзе ўдалося правесьці калектывізацыю на 50 проц., што значна перавышае плян.

Член **Камароўскага** сельсавету, Плакунаў, даведаўшыся аб прыезьдзе брыгады, склікаў таемны сход, дзе выступаў проці калектывізацыі.

На сходзе па арганізацыі калгасу імя «1-га Мая» хацеў пралезьць у калгас Селязьнёў Кірыла—быўшы бандыт, і калі яму далі адпор, ён пачаў лаяць савецкую ўладу. Брыгада высьветліла, што дзеці кулакоў Мацэнка і Туфа нейкім чынам пралезьлі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Ленінградзе.

Работа толькі пачынаецца

Хоць па пляну ў **Сіроцінскім** раёне суцэльная калектывізацыя павінна быць скончана не пазьней 1-га лютага, але на сёньня, як выявілі брыгаднікі **Люгоўскі** і **Скараходаў**, толькі пачынаецца. Кулацтва праяўляе актыўнае сапраціўленьне. У **Лаўжанскім** і **Сіроцінскім** сельсаветах заможнікі-лішэнцы склікаюць таемныя сходы, на якіх абгаворваюць мэтады зрыву калектывізацыі. Раскулачваньне праводзіцца недаволі рашуча. У **Жарабіцкім** сельсавеце раскулачана толькі 6 гаспадарак, а там іх значна больш, і яны праяўляюць сваю варожую дзейнасьць. Вось прозьвішча некаторых: **Бейневіч, Матросаў, Гутарэнна, Бондараў, Цімафееў і Шчупін.** Цяжка праводзіць работу сярод старавераў, у якіх яшчэ моцна трымаецца рэлігійны фанатызм.

Настаўніцтва не дапамагае ў рабоце. Шмат у якіх школах у комплекс ня ўведзены тэмы калектывізацыя і пасеўкампанія. У культурную работу настаўніцтва ня ўцягнута. Няма кніжак, якія-б дапамаглі селяніну разабрацца ў пытаньнях калектывізацыі.

У райвыканкоме старшыня Науменка ніяк ня мог знайсьці часу пагаварыць з брыгаднікамі, але ўсё-ж зрабіў заўвагу: «Ведаю я, зачым вы прыехалі».

Адчуваецца вялікі недахоп у працаўнікох. Там, дзе бываюць брыгады, адразу-ж вызначаецца значны зрух у бок калектывізацыі.

У **Амбросаўскім** сельсавеце грамадзкія арганізацыі зусім адсталі ад работы па падрыхтоўцы да сяўбы і ня прымаюць ніякага ўдзелу. Вельмі слаба праводзіцца ачыстка насеньня. Яшчэ ёсьць шмат нераскулачаных кулакоў. Сэкратар сельсавету вельмі грубы з сялянамі. Сярод моладзі культасьветная работа адсутнічае.

Абагульваньне насеньня ў **Дабейскім** сельсавеце ідзе самацёкам. Машынна-конных станцый зусім няма і яны не арганізоўваюцца. Няма таксама і рамонтных брыгад. Да вывазу вапны яшчэ ня прыступалі. Пытаньні пасеўнай кампаніі зусім не асьвятляюцца ў насьценгазэце.

Кулакі дзейнічаюць

Актыўна выступае кулацтва. Тры браты Галубовічы, прыцягнуўшы на сход усе свае сем'і, хацелі сарваць арганізацыю калгасу, але гэта ім не ўдалося. Кулакоў пастанавілі выселіць, і Галубовічы пасьля склікаюць свой сход і абгаворваюць мэтады барацьбы супроць высяленьня.

Ёсьць шэраг выпадкаў, калі паасобныя дакладчыкі няўмела праводзілі сходы, у выніку чаго стваралася блытаніна, недарэчнасьці, няправільнае разуменьне праводзімых мерапрыемстваў, абіраўся старшынёй сходу эсэр.

Член сельсавету Вахтоўскі варожа адносіцца да калектывізацыі, ён сам мае кулацкую гаспадарку. Суседзям ён не дае браць ваду і загадвае сваёй жонцы: „Не давай гэтым мерзаўцам вады, бо яны ў калгас запісаліся».

Культурная работа ў сельсавеце вельмі слабая. Газэты спазьняюцца, чытальня пад замком, гутаркі з сялянамі не праводзяцца.

Падрыхтоўка зрываецца

Брыгада ў складзе **Сэгаля** і **Трафімава** зрабіла налёт на шэраг сельсаветаў **Віцебскага** раёну. Асабліва дрэнна справа з падрыхтоўкай у **Кабішчанскім** сельсавеце. **Вучот насеньня і жывёлы не праведзены, кантрактацыя зрываецца. Члены сельсавету ня ўступілі ў калгас.** Мала таго, некаторыя з іх вядуць разлагаючую работу сярод беднаты. Сельсавет ня змог арганізаваць вакол сябе актыў, работу праводзіць бяз пляну. Нічога ня робіць камсамольская ячэйка. У выніку—падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі па сельсавету зрываецца, і каб папярэдзіць зрыў, неабходны тэрміновыя меры.

У **Курынскім** сельсавеце работа пачынае наладжвацца, пасьля таго, як стары склад сельсавету за бязьдзейнасьць распушчаны. Вызначаны плян калектывізацыі ўсяго сельсавету. Няма яшчэ звестак аб патрэбе ў насеньні. 13-га лютага пачалася ссыпка насеньня ў памяшканьні царквы. **Збор попелу не вытвараецца. Таксама не зьбіраюцца сродкі на трактарныя налёны. Няма насьценгазэты. Рамонтныя брыгады з гораду не прыяжджалі.**

Варожыя элемэнты ўсякімі спосабамі шкодзяць калектывізацыі. Так, на сходзе ў вёсцы **Ізохава** выступіла нейкая **Кузьміна** пад відам бяднячкі, якая заявіла: «Вы памрэце з голаду, вас пасадзяць у клетку, завяжуць у мяшок... Не запісвайцеся ў калгас». Кузьміна—сястра быўшага гарадавога, займаецца зараз чарадзействам і мае значны ўплыў на жанчын, калісьці разам з братамі, трымала сувязь з бандытамі. Усё-ж, нягледзячы на яе агітацыю, сход пастанавіў арганізаваць калгас.

Брыгада зьвярнула ўвагу на тое, што абагульваемая жывёла ставіцца ў агульнае памяшканьне бяз папярэдняга ветэрынарнага агляду, ад чаго распаўсюджваецца зараза. Так, племянны бык з каростай стаіць разам з здаровай жывёлай.

У калгасе «Пралетары» машыны патрабуюць рамонту. Неабходна ўзяць на вучот усё жалеза, якое знаходзіцца ў старым закінутым млыне, бо яно зараз раскрадваецца.

Трэба выявіць вінаватых

Брыгаднік **Д. Ісаакоўскі** з Вярхоўскага сельсавету, **Бешанковіцкага** раёну, паведамляе, што сельсавет калектывізаваны поўнасьцю. Ужо афарміліся два моцных калгасы „Віцебскі пралетары" і «Бальшавік». Абагульваецца насеньне і маёмасьць, шпарка ідзе ачыстка збожжа. Не хапае трыераў. Неабходна таксама складаці вытворчы плян калгасаў.

У сельсавеце ў мінулым годзе быў арганізаваны маленькі калгас, у якім гаспадарылі пʼяніцы **Аўчынікаў** і **Чашніцкі**. Адпушчаныя на каапэраваньне беднаты грошы яны скарыстоўвалі на гарэлку. Чашніцкі ўзысківаў па 5 р. з членаў калгасу ў кошт паёў, але гэтыя грошы нідзе ня значацца. **У выніку гэтага гаспадараньня за Чашніцкім і зараз лічыцца 400 руб. Што рабілі Вярхоўскі сельсавет і райвыканком, ведаючыя пра ўсё гэта—невядома.** Цяпер Чашніцкі заяўляе: «Калі ў мяне возьмуць карову ў калгас, дык я каго-небудзь зарэжу». Трэба неадкладна высьветліць вінаватых і прыцягнуць да адказнасьці.

Нядбайнасьць сельсавету і яго старшыні Судніка выявілася ў тым, што ён некалькі год не абкладаў індывідуальным падаткам кулацкую гаспадарку Дзямешка і даў ёй магчымасьць распрадаць сваю маёмасьць і выехаць з сельсавету. Сельсавет нават дом у Дзямешкі адкупіў, а пасьля яе ад'езда дадумаўся абкласьці індывідуальным падаткам.

Кулацкі падпявала

Нерашэўна праводзіцца раскулачваньне ў **Чашніцкім** раёне. Старшыня праўленьня **цяпінскага** калгасу, член партыі Яцук нават дапамагае кулаком, купляе ў іх для калгасу розную маёмасьць. Так ён дае задатак за будынкі кулаку Пуху, Бенедыктаву, Вячэрскай. У кулака Думава, з Лепельскага раёну, Яцук купіў жывёлу за 181 руб. Кулака Ўнуковіча Яцук некалькі разоў прасіў уступіць у калгас, а зараз гэты кулак арыштаваны і маёмасьць яго канфіскавана. У калгасе сабрана ўсяго каля 120 кілёграм попелу—і той ляжыць пад сьнегам.

Неабходна зараз-жа прыняць тэрміновыя меры да выпраўленьня ўсіх недахопаў, якія выяўлены брыгадамі, з тым, каб забясьпечыць сваечасовую падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы. Час да вясны застаўся малы і мешкаць нельга.

Ураженьні з Высачан і Лезна

— Да пасеўнай кампаніі мы падрыхтаваны,—з гордасьцю кажа сэкратар рабочкому саўгасу Крынкі.

На сходзе рабочых абгавораны прыкладны плян пасеву. Насеньне падрыхтавана. Заканчваецца рамонт сельгасмашын, праверан кожны кавалачак зямлі, што і калі можна сеяць.

Саўгас мае 460 га зямлі. Нягледзячы на тое, што пахатнай зямлі мала, усё-ж пасеўная плошча ў гэтым годзе будзе павялічана на 8 га.

Зроблена, але мала

11-га лютага мы накіраваліся ў Высачаны. Наша задача—выявіць, як рабочыя фабрыкі імя Карла Маркса рыхтуюцца да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

З боку ад фабрыкі, на гары—фабрычны клюб. У гэтым клюбе няма ніводнага плякату, прысьвечанага пасеўнай кампаніі. У насьценгазэтах толькі адна заметка аб калектывізацыі.

Першыя крокі па падрыхтоўцы да сяўбы зроблены. Вылучаны брыгады, 90 проц. гаспадарак перайшлі на суцэльную калектывізацыю. Фабком пакуль яшчэ не займаўся пытаньнем арганізацыі рамонтных брыгад для пачынкі сельска гаспадарчых машын. Збор попелу ідзе слабым тэмпам. Не займаўся фабком і арганізацыяй у калгасах вытворчых нарад.

Гэта кажа нам аб тым, што партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі фабрыкі недастаткова інструктавалі брыгады. У в. Куркова, Высачанскага раёну—дзе большасьць бедняк,—з 35 гаспадарак уступілі ў калгас 5. Ня лепш і з абагуленьнем жывёлы. Праз месяц пачынаецца пахата, а цяглавая сіла ў калгасах не падрыхтавана. Засталося вельмі мала часу для таго, каб выканаць намечаны плян. Пасьпяшайцеся!

„Справа ня ваша"

На гадзіньніку—без 10 хвілін 4, а ў Высачанскім райвыканкоме нікога няма.

— Дзе вашы супрацоўнікі?—пытаемся ў аднаго, выпадкова застаўшагася ў канцэлярыі.

— А так, што ўжо скончылі.

— Ну, тады выбачайце, зайдзем заўтра...

***

— Сколькі ў вашым раёне двароў.

— 6000.

— Ці ўсе калектывізаваны?

— Усе (?!)

— А як у вас з падрыхтоўкай да пасеўкампаніі?

— Рыхтуемся, — адказвае тэхсэкратар райвыканкому.

— А можа вы скажаце, наколькі мяркуюцца пашырыць пасеўную плошчу ў гэтым годзе?

— Пашырым...

— На сколькі?

— Гэтыя зьвесткі, — каротка адрэзаў стаіўшы радам каморнік Каралькоў,—вы можаце атрымаць у раённага землеўпарадкавацеля, а працаўнікам райвыканкому гэта ведаць неабавязкова.

Раўняйцеся па саўгасу „Адаменкі!"

13-га лютага мы наведалі калгас «Адаменкі», Лёзьненскага раёну.

Саўгас мае 550 гэкт. зямлі. Падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі ідзе ўзмацнёным тэмпам. Насеньня загатоўлена на 90 проц. Цяглавай сілай забясьпечаны. Пасеўную плошчу мяркуецца пашырыць на 15 гэктараў. Плян збору попелу выкананы **на 75 проц.** Рабочыя саўгасу сваечасова паставілі пытаньне аб арганізацыі працы ў саўгасе. Вызначаны шэраг мерапрыемстваў да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі. Пры саўгасе арганізаваны агранамічныя курсы.

Да вясны саўгас «Адаменкі» амаль што падрыхтаваны. З першым вясенънім сонейкам усе дружна выйдуць на поле.

А тут пад пагрозай зрыву

Буйнейшай камунай у Лёзьненскім раёне зьяўляецца камуна «Камінтэрн», маючая 4000 гэктараў зямлі, з якой пахаты 2520 гэктараў.

Падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі ідзе вельмі слаба. Вытворчыя пляны зусім адсутнічаюць. Пачынка сельгасмашын не пачыналася. Камуна яшчэ не займалася пытаньнямі арганізацыі працы. Большасьць сялян у раёне камуны яшчэ не ўразумелі значэньне калектывізацыі і пасеўнай кампаніі.

У вёсцы Азеркі многія сяляне, уходзячы на сход, дзе стаяла пытаньне аб абагуленьні жывёлы, сказалі: «Няхай арыштуюць, а каровы не аддамо».

Усё гэта кажа аб тым, што без адпаведных мерапрыемстваў плян пасеўнай кампаніі будзе сарваны.

Прафарганізацыі, дзе вы?

Лёзьненскія прафарганізацыі яшчэ да гэтага часу не адгукнуліся Мясцком мэдсанпрацы зусім нічога не зрабіў для таго, каб падрыхтавацца да пасеўнай кампаніі. Пляну правядзеньня кампаніі—**няма.** Адсутнічае ўсякая ініцыятыва па пытаньням калектывізацыі. Характэрны словы старшага ўрача. Ён кажа: «Калі ў нас ёсьць патрэба, дык нас пашлюць».

Інтэлігенцыя ў раёне да гэтага часу не раскачалася.

Рабочком **сельгасрабочых** таксама слаба падрыхтаваны да пасеўкампаніі. Рабочыя недастаткова наведваюць сходы па калектывізацыі. Характэрна, што рабочком да гэтага часу ня ведае, сколькі батракоў уступіла ў калгас. А іх зусім ня так ужо многа, каб мець аб гэтым праўдзівае ўяўленьне. Зусім дрэнна з падрыхтоўкай у мясцкоме **чыгуначнікаў станцыі Лёзна.** Пытаньні пасеўнай кампаніі нават ня ставіліся на абгаворэньне мас. Мясцком злачынна губляе час. Застаўся ўсяго адзін месяц, а ім нічога ня зроблена.

Вылучаныя брыгады амаль ніякай работы ў вёсках не правялі. Вось табе і «дапамога» прафсаюзу!

М. Евелеў.

НАЛАДИТЬ РАБОТУ В ЖАКТАХ!

Изжить протекционизм и головотяпство!

Справились с новыми задачами

Как только жакту № 12 были переданы муниципализированные дома, правление сразу энергично взялось за выявление и выселение лишенцев. Результат работы уже налицо—около 80 проц. выявленных лишенцев уже освободило жилплощадь. Активное участие в этом деле проявили правленцы т. т. Лотовский и Шадхин, которые проводили четкую, классовую линию в этом деле.

За счет выселенных нэпманов удалось удовлетворить лучшими квартирами 20 семейств рабочих и служащих.

Кроме этого, жакт производит уплотнение в домах, где раньше роскошествовали, переселив туда из подвалов рабочих, тем самым на много смягчив жилищный кризис в жакте. Работа по уплотнению и переселению продолжается и надо надеяться, что правление жакта полностью справится с стоящими перед ним задачами.

Пайщик.

„Беспризорные дома" в жакте № 5

С 1 го января 1930 г. было **передано Горсоветом жакту № 5 большое количество ценных домов, как-то: Ривина, Ратнера, Шнера и других.**

Прошло больше месяца, **а ничего жактом не сделано для урегулирования положения жильцов этих домов.** Жильцы не знают, кому платить за воду и квартирную плату. Благодаря такому руководству жакта, **никто из жильцов до сих пор не вступил в пайщики.** Жакт не учитывает того обстоятельства, что **в этих домах живет много** лишенцев и кустарей. Такой элемент недоволен тем, что дома перешли в ведение жакта, и **каждый из них старается нанести какой-нибудь ущерб дому.** Сам Шнер, когда уезжал, то ломал и увозил с собою, все что мог, например: ванну, которая принадлежала дому.

(Жилец)

—»—

Уже прошло 6 месяцев, как перешли от коммунотдела в ведение жакта № 9 дома, помещающиеся по Вокзальной ул. 39.

За эти шесть месяцев жакт никакого ремонта не произвел. На просьбу живущего в этом доме рабочего водного транспорта т. Колодинского починить хотя бы совершенно сгнившие оконные рамы, правление ответило решительным отказом, между тем, как «своим» правленцы предоставляют лучшие помещения. Колодинский занимает с семьей в три человека совершенно сырую, холодную комнату в 3 кв. сажени.

„Диктатура" преда Ривина

При передаче новых домов жакту № 13 освободилась жилая площадь, которую, при правильном переселении и уплотнении, можно было бы удовлетворить почти всех жильцов, живущих в ужасных условиях.

Была назначена комиссия по осмотру квартир, но предправления Ривин распределяет свободные квартиры по своему. Так, например, он «распорядился» вселить в квартиру Альшевского (ул. Бебеля, 19) своего родственника Герцкина. Без разрешения правления, Ривин пишет приказ т. Глазунову (управдомами) предоставить комнату по 3-й Благской, 25, домработнице, служившей у Герцкина, которая не состоит даже пайщицей. А жильцы тщетно обивают пороги правления жакта с просьбами о переселении и предоставлении комнат или квартир.

Квартплата в жакте № 13 взимается неправильно: у квартиронанимательницы Бояриновой берется плата и за кухню, вопреки постановлению Горсовета. Все эти факты требуют срочного расследования окружилсоюзом и РКИ. Нужно и досрочное переизбрание правления.

(Пайщик).

Гнездо протекционизма и хулиганства

«Свой» пишет нам о гнезде протекционизма и хулиганства, образовавшемся в жакте № 1 под крылышком председателя жакта Курсанова и управдома Соколова. Последний имеет «доброго знакомого» Богданова, который распоряжается в жакте, как в своей «вотчине».

Захотел Богданов выжить проживающую в жакте № 1 гр-ку Шляпину, чтобы завладеть ее квартирой, и вот он сразу идет на приступ. 26 января он вместе со своим приятелем, управдомом Соколовым, взял с собою милиционера, учинили акт форменного самоуправства и хулиганства.

Богданов—хулиган и пьяница, подобрал себе «под масть» такую же компанию—своего собутыльника Сюртукова («типа» из Соловок), а также известную самогонщицу гр. Тышкевич, которая, между прочим, успела «устроиться» санитаркой в заразную больницу.

Вся эта «теплая компания» устраивает частые попойки и скандалы, превратив жакт в настоящий вертеп.

З.

Жактовские занозы

В доме по Замковой 5, кв. 11, проживает **Ольга Ивановна Ковалева. Работая в жакте № 4 секретарем, растратила 120 рублей** из собранных ею квартирных денег. Правление жакта подало на нее в суд, который приговорил Ковалеву к уплате этой суммы. **Дело слушалось еще в 1926 году, но до сих пор Ковалева не уплатила этих денег.** Непонятно, почему правление жакта не передает исполнительный лист на место службы Ковалевой, которая работает на швейной фабрике «Профинтерн» и получает 150 рублей в месяц.

(С. Б.).

— В жакте № 6 многие **пайщики ютятся по сырым и полуразвалившимся квартирам, а для правления жакт забирает первоклассную квартиру.** Между тем как прежнее помещение, которое занимало правление, также было вполне пригодно.

(Рабочий).

З.

Бесхозяйственность и финансовый кавардак

Правление **жакта № 6** имеет много недочетов в своей работе. **Счетоводство** с августа **запущено**, и результаты операционного года известны одному аллаху или... новому счетоводу и делопроизводителю т. Гребенкову, у которого что-то неладно с подотчетными суммами. Некий гр. Ерущенко, проработавши в жакте недели две, оставил после своего ухода «хвостик» рублей в сорок. **Квартплаты от жильцов на 1 января 1930 г. недополучено 6000 руб. Сам жакт в долгу, как в шелку.** Новый операционный 1930 г. обещает быть не лучше предыдущего. Правленский глаз заглядывал в дела и жизнь жакта **от заседания до заседания.** Жильцы ежедневно **осаждают тщетно правление с вопросами по ремонту квартир,** о предоставлении квартир и проч. **Открытие детского сада** совместно с жактами №№ 6 и 7, для чего необходимо было затратить лишь незначительную сумму на ремонт дома (предоставленного жилсоюзом)—**висит в воздухе,** так как предправления Аврускин «принципиально» отказался от этого дела, выставляя свои требования и не считаясь с постановлением правления.

Вообще, работа правления хромает на все четыре ноги. Необходимо лечебное вмешательство РКИ.

Жакт № 3 имеет в своем ведении **дом № 6 по Рождественской набережной, но за домом никто не смотрит.** Осенью от грязи в воротах нельзя было пролезть, а в настоящее время невозможно пролезть от снега. Жакт аккуратно собирает с жильцов плату за воду, но воды в квартирах жильцов не имеется, так как **трубы замерзли и жакт не позаботился об их ремонте.** Теперь квартиранты **ходят за водой на Двину.** В декабре лопнула водоотводная труба и чтобы починить ее, пришлось жильцам ходить в жакт около месяца. **(Мишель).**

Управдом жакта № 3 Шуганов при обмере вновь принятых домов не забыл и себя. Проживая в жакте не больше года, он выбрал по своему вкусу (а вкус у него хороший) и занял без разрешения правления самую лучшую квартиру. Об этом отлично знали, как председатель правления т. Смольский, так и представитель окружилсоюза т. Кейв, но они совершенно забыли, что пайщики-рабочие живут в сырых подвалах. **(Око).**

В жакте № 2 творятся безобразия. Некоторые правленцы выбрали себе лучшие квартиры и отремонтировали их, не жалея жактовских денег, **а заявления рядовых пайщиков маринуются по году и более. Есть такие, которые ютятся с семейством на 1½ квадратной сажени.** В лучшем случае, им предлагают проходную комнату с пятью дверями. Ремонт производится в первую очередь, и даже вне очереди, правленцам и их знакомым. **(Наблюдающий).**

Зет.

Кое-что еще о жилтовариществе № 10

О составе правления жакта № 10 и нечистых делишках, творящихся в этом жакте, мы получили следующие дополнительные сведения (к заметке, помещенной раньше в нашей газете).

Технический секретарь Камышев, как говорят, служил в полиции. После Октябрьской революции Камышев устраивается в жакте № 33 (ныне № 10) и предоставляет квартиру кустарю Фисельсону Ш. (по Канатной № 30),—бывшему хозяйчику и эксплоататору, который по ликвидации своей мастерской пролез на фабрику Леккерта и в союз. Недавно Фисельсон был присужден к 15 рублям штрафу за издевательство над другими жильцами жакта. Но, как видно, Фисельсон имеет сильную протекцию, так как ему все сходит с рук, хотя он более двух лет не платит за квартиру.

(Свой).

Дома, расположенные по Мижне-Петровской 37, принадлежали раньше домовладельцу Федорову, а теперь отошли к жакту № 10, но **о выселении бывшего хозяина никто и не подумал.**

(К—ич).

З.

„маринад"

Есть много оснований предполагать, что «помощь» жилстола не пойдет дальше этих 25 копеек. Не является ли такое отношение издевательством над самыми законными нуждами и требованиями рабочих?

(Рабкор Аронов).

— В невозможных квартирных условиях живет рабочий ассенизатор Рыжиков (Лагерная, 7). **Пять душ семьи—на одной квадратной сажени. Потолок провалился.** Были обследования санкомиссии и союза коммунальников, которые постановили предоставить Рыжикову квартиру в первую очередь, но **заявления рабочего по прежнему маринуются в коммунотделе уже больше года.**

(Грищенко).

Домовладельцы-живодеры

В 3-м районе по 1-му Мишукину переулку многие домовладельцы совершенно не считаются с законом о квартирной плате.

Владелец дома № 15 Бас (член союза) заставляет своего квартиранта рабочего на очковой фабрике платить **за 2 квадратных сажени 14 руб.**

Домовладелец Кислинов (№ 13) заставляет квартиранта рабочего ф-ки им. Леккерта платить **столько же за «квартиру» в одну кв. сажень,** угрозами и всевозможными преследованиями (не пускает варить в печке и др.).

Домовладелица М. Соломоник, имеющая два дома (№ 7), сама работница швейной фабрики № 2, дерет со своего брата-рабочего чулочной фабрики **за две квадратных сажени 15 рублей.**

Знающий.

Какие дома строить?

В настоящем году по строительной программе намечается постройка двух домов, стоимостью около 1 миллиона рублей, из которых один дом—в Марковщине, а другой—в городе, при чем один из этих домов предполагается построить по старому типу,—с отдельными для каждой семьи кухнями и пр.

Тов. **Стрин** пишет о нерациональности возведения такого дома, в котором предусматривается постройка 60 кухонь. Не лучше ли вместо 60 кухонь иметь лишних жилых 40 комнат, а 20 комнат предоставить для общественного пользования, как-то: для общей столовой, общей кухни и т. д. Ведь дом будет выстроен через два года. Неужели-же через два года у нас в городе, когда деревня идет к сплошной коллективизации, мы попрежнему будем ютиться в отдельных клеточках с отдельными кухнями? Ведь такой дом трудно потом переделать в дом коммуны.

З.

—»—

Вниманию комиссий содействия госкредиту при учреждениях, предприятиях и сельсоветах

В связи с тем, что 1 марта в гор. Ленинграде состоится 1-й тираж 3-го займа индустриализации, комиссиям содействия необходимо в срочном порядке проверить обеспечение подписчиков на заем закрепительными талонами и принять меры, чтоб за несколько дней до тиража выдать полностью талоны на руки подписчикам.

—o—

Гастроли Громова и Милича (Цирк)

Витебский зритель, к сожалению, никогда не был особенно избалован настоящей революционной сатирой. Тот репертуарный суррогат, начинающийся от набивших оскомину кооперативных очередей до номеров о женах и мужьях обычно преподносился на советской эстраде, как образец «идеологически выдержанной», «революционной» сатиры. К тому-же антихудожественное исполнение было постоянным спутником этой халтуры.

Гастроли сатириков Громова и Милича, их острая политическая, революционная сатира, их хлесткий бичующий и остроумный репертуар, в надлежащей художественной передаче—нагляднейшим образом свидетельствуют о наличии у нас представителей настоящей советской эстрады.

Одна из важнейших заслуг Громова и Милича это—умение подобрать действительно современные номера эстрадного репертуара. В своем политическом обзоре сатирики остро охватывают международное положение, социалистическое соревнование, пятилетку, займы и ряд других важнейших и злободневных вопросов. Сатира Громова и Милича крепко бьет по головотяпству, бюрократизму и бесхозяйственности. Неудачным только в отдельных частях является номер с чисткой, который претит довольно выдержанному репертуару сатириков.

Громова и Милича следовало-бы перебросить на крупнейшие предприятия, или в рабочие клубы. Дирекции цирка об этом следует подумать.

Нельзя не упомянуть и о гастролях музыкальных сатириков Комарро и Крилини. Не вдаваясь в оценку их репертуара, следует сказать о номере «В Москве и Витебске». Высмеивая местные недостатки, бойкие сатирики серьезно считают постановку медицины в Витебске ни чем иным, как коновальство. Лучший лексикон для витебской молодежи Комарро и Крилини не могли придумать, как «шпана» («в Москве хулиганы, а по витебски—«молодежь»). Возможно, что в Москве этот номер называется сатирой, а уж (извините нас, провинциалов) по нашему—это халтура.

Лев Ю—и.

Благодарность артистам

Окружное совещание рабселькоров и редакции газеты «Віцебскі Пралетары» выносит товарищескую благодарность артистам цирка, жонглерам трио **Расинки, Эскеральде,** сатирикам **Вельдемару и Жанете, Лувэ и Рудольфу** и артистам русской драмы **Скальскому, Александровой, Никитину, Федоровой** и пианистке **Эпштейн** за их бесплатное участие в концерте, организованном для окружного рабселькоровского совещания.

ПАСТАНОВА

прэзыдыуму Віцебскага Гарадзкога Савету ад 18-га лютага 1930 г.

Па дакладу аб сьвяткаваньні гадавіны Чырвонай арміі

12-я гадавіна Чырвонай арміі прыходзіць ва ўмовах шпаркага тэмпу будаўніцтва сацыялізму, нябывалага размаху калектывізацыі і ажыццяўленьня новага лёзунгу партыі—ліквідаваць кулака, як клясу, у раёнах суцэльнай калектывізацыі, ва ўмовах абвостранага міжнароднага становішча. Усё гэтае выклікала шалёнае супраціўленьне клясава-чуждых элемэнтаў унутры краіны і ўзмацніла актыўнасьць імпэрыялістых, падрыхтоўваючых новую вайну супроць краіны саветаў.

Выходзячы з вышэйпрыведзенага, прэзыдыум Гарадзкога Савету **пастанаўляе:**

Заклікаць рабочых гораду да яшчэ большай згуртаванасьці для барацьбы, узмацніўшы ўвагу да гатоўнасьці краіны саветаў адбіць рыхтуючыйся напад.

Лепшым спосабам узмацненьня абароназдольнасьці краіны ў наступны момант зьяўляецца:

1) Барацьба за выпаўненьне прамфінпляну на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарных тэмпаў работы.

2) Узмацненьне работы па калектывізацыі акругі, правядзеньне лёзунгу партыі—аб ліквідацыі кулака, як клясы, узмацненьне работы з батрацтвам і беднатой, умацаваньне сельскіх і раённых саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту.

3) Забясьпечыць пясьпяховае выпаўненьне вясеньняй пасеўнай кампаніі, дапамагаючы абагуленьню насенных фондаў, жывёлы і інвэнтара.

4) Забясьпечыць работу ваенных гуртко ў і ваенізацыю рабочых і насельніцтва, для чаго ў дні гадавіны Чырвонай арміі арганізаваць масавую праверку пастаноўкі вайсковай работы на прадпрыемствах і ўстановах, прыстасаваўшы да гэтых дзён адчыненьне ваенных куткоў, курсаў і гуртко ў і праводзячы разам з воінскімі часткамі масавыя вайсковыя спаборніцтвы.

5) Арганізаваць у дні гадавіны Чырвонай арміі масавае наведваньне рабочымі заводаў і фабрык чырвоных казармаў і байцоў Чырвонай арміі. Шырока растлумачыць чарговыя задачы, стаячыя перад прадпрыемствамі і часткамі Чырвонай арміі ў сувязі з яе вучобай і прадстаячымі манэўрамі.

6) Прэзыдыум Гарсавету абавязвае ўсіх членаў Гарадзкога Савету прыняць самы актыўны ўдзел у сьвяткаваньні і ў праверцы сацдагавору паміж часткамі і прадпрыемствамі, у арганізацыі праверкі вайсковай работы на прадпрыемствах і ходу вучобы ў частках і арганізацыі ўзаемных экскурсій.

7) Прэзыдыум Гарсавету заклікае ўсіх членаў Гарсавету прыняць актыўны удзел у зборы падарункаў для частак гарнізону і частак Асобай Дальня-Усходняй арміі.

Старшыня віцебскага Гарсавету **Дзянаў.**

Сэкратар віцебскага Гарсавету **Фішман.**

Аб увядзеньні безнаяўных разьлікаў

(Пастанова прэзыдыуму акрвыканкому ад 19-га лютага 1930 г.)

Маючы на ўвазе, што віцебскі дзяржбанк зьяўляецца адзіным банкам, канцэнтруючым усе крэдытна-разьліковыя апэрацыі, што ён зьвязан непасрэднымі карэспандэнтскімі ўзаемадносінамі з усімі раённымі крэдытнымі таварыствамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі акругі, што ён таксама зьвязан з паштова-тэлеграфнымі ўстановамі і касамі ашчаднасьці ў сэнсе рэгуляваньня іх касавай наяўнасьці, як у гарпасяленчых, так і на вёсцы, у мэтах максімальнага скарачэньня зварочваюмых на грашовым рынку эмісіённых рэсурсаў і найлепшага і рацыянальнага скарыстаньня іх, прызнаць неабходным:

1. Увесьці безграшовыя разьлікі паміж асобнымі ўстановамі і прадпрыемствамі сацыялістычнага сэктару, абавязаўшы іх цалкам перайсьці на чэкавую сыстэму разьлікаў праз крэдытную сыстэму, як у горадзе, так і на вёсцы, зьвяўшы да мінімуму сталую касавую астачу.

2. Абавязаць усіх кіраўнікоў дзяржаўных, каапэрацыйных устаноў і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў г. Віцебску і па раёнах, вытвараць усякія грашовыя разьлікі па апэрацыях паміж горадам і вёскай і надаварот толькі праз карэспандэнцкую сетку дзяржбанку і пантова-тэлеграфныя ўстановы.

3. У адпаведнасьці з гэтым забараніць усім дзяржаўным, каапэрацыйным і грамадзкім установам і прадпрыемствам Віцебскае акругі пераброску грашовай наяўнасьці ў натуры праз нарочных і ўсякімі іншымі спосабамі з гораду ў вёску і наадварот, за выключэньнем выпадкаў асаблівага парадку.

4. Лічыць неабходным увесьці безграшовыя разьлікі таксама і па плацяжах насельніцтва дзяржаўным, камунальным і капэрацыйным прадпрыемствам у горадзе Віцебску, у першую чаргу на аплаце камунальных паслуг (за ваду, сьвет, кватэру і г. д.)

5. Даручыць гарсавету і валютнаму інспэктару ў тэрміновым парадку распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўвядзеньню безграшовых разьлікаў па плацяжам насельніцтва ў жыцьцё не пазьней 1 красавіка 1930 г.

6. Дзяржбанку ўстанавіць новы парадак разьлікаў паміж установамі і прадпрыемствамі не пазьней 1 сакавіка, а валютнаму інспэктару мець назіраньне за правядзеньнем гэтага ў жыцьцё.

7 Акруговай касе ашчаднасьці, у сувязі з ажыцьцяўленьнем безграшовых разьлікаў, пераглядзець сетку кас па акрузе і прыстасаваць іх да выкананьня новых абавязкаў.

8. Акруговай міліцыі ў тэрміновым парадку распрацаваць і правесьці ў жыцьцё неабходныя мерапрыемствы па ўзмацненьню абароны разьліковых кас у раёнах.

9. Даручыць валютнаму інспэктару, дзяржбанку і акруговай касе ашчаднасьці, акрпрафбюро і газэце «Віцебскі Пралетары» безадкладна пачаць шырокую папулярызацыйную кампанію новай сыстэмы разьлікаў сярод працоўных мас.

Заседание штаба культпохода

25 февраля, в 10 часов утра, в помещении ОК КП(б)Б (комната медбюро) созывается заседание штаба культпохода

Явка всех завклубов, как гражданских, так и воинских частей, директоров театров, цирка, представителя Белгоскино и членов президиума—обязательна.

— На 24-га лютага, а 12 гадз. дню, гарадоцкі райком КПБ склікае нараду ўпаўнаважаных шэфствуючых арганізацый г. Віцебску з прадстаўнікамі падшэфных арганізацый раёну.

На абвестку дню—наступныя пытаньні:

1. Аб канкрэтных задачах, стаячых перад шэфарганізацыямі на бліжэйшы час.
2. Разгляд плянаў кожнай шэфствуючай арганізацыі.

Гарадоцкі РК КП(б)Б.

Паведамленьні

27-га лютага, а 12 гадзіне дню, склікаецца плэнум акруговай кантрольнай камісіі КП(б)Б у памяшканьні АКК РСІ (Замкавая, 24) з наступнай абвесткай дню:

1. Вынікі абсьледаваньня ЦКК працы АКК—РСІ (дакл. т. Мумдау).

2. Вынікі праверцы і чыстцы савецкіх і вучэбных ячэек і папярэднія вынікі чыстцы вытворчых ячэек (дакл. т. Жмырко)

На плэнум запрашаюцца ўсе члены АКК і ЦКК і ўсе старшыні раённых камісій РСІ.

— 23-га лютага склікаецца 1-я ўводная канфэрэнцыя слухачоў завочных курсаў партактыву пры камуніверсытэце Беларусі імя У. І. Леніна прыёму 1929-30 навучальнага году па віцебскай акрузе, пры віцебскім АК КП(б)Б.

Парадак дню канфэрэнцыі наступны:

1) Абгаварэньне арганізацыйнага пытаньня завочна-курсавой вучобы.

2) Два даклады—лекцыі па мэтодыцы завочнага навучаньня.

3) Лекцыя «Паняцьце аб прадмеце і мэтадзе палітэканоміі».

4) Распрацоўка аднаго заданьня па палітэканоміі і пад кіраўніцтвам выкладчыкаў; і

5) Даклад па актуальнаму пытаньню бягучага партыйнага жыцьця ўмоўна.

— В воскресенье, 23-го февраля, в 6½ часов вечера, в помещении «Дворца труда» (комн. № 11) созывается **общесоюзное собрание посвященное 12-й годовщине Красной армии.** Все члены союза нарпит должны присутствовать. Просьба к нанимателям отпустить своих домработниц к указанному времени.

23-го февраля, в 6½ часов вечера, в клубе «Красный строитель», состоится конференция читателей библиотеки и членов клуба. Билеты в библиотеке и по рабочкомам.

Правление.

Недельный рабочий университет

В воскресенье, 23 февраля, для всех факультетов читают лекции: проф. Шлиттер на тему: «Учение Дарвина» и лектор Старовойтов на тему: «Международное положение СССР».

Начало занятий ровно в 10 час. утра в ветеринарном институте.

— При витебском ветеринарном институте организуются курсы по подготовке рабочей молодежи во ВТУЗ. Курсы рассчитаны на 6-месячный срок обучения. На курсы принимаются только по разверсткам районов комсомола.

Занятия начнутся с 24 февраля, в 6 часов вечера. Все выделенные т.т. должны явиться в здание ветинститута к указанному времени.

Ці ёсьць адводы?

Ячэйкамі КПБ 2-га раёну прыняты ў кандыдаты партыі наступныя таварышы: Кантман М. Б., Баранова Р. Г., Дольнік Б. С., Прэйс М. Л., Гутман І. Д., Кан Б. М., Грутман М. І., Кавацюўскі І. В., Шэляго Н. К., Болітэр М. Ш. Клавір А. Л. (к-ву КПБ ф-кы «Прафінтэрн» № 1), Выдрэвіч С., Сарак Х. М.—(яч. КПБ цюцюнавай ф.), Васкабойнік Р. І., Паценкор І. І., Расін Б. І. (яч. КПБ ф. «Прафінгэрн» № 3), Рызо М. Е., Гнутаў І. Е., Маёраў Ф. Н., Капялюшнікаў Д. Е, Мутоўкін В. К. (к-ву КПБ «Чырвоны мэталісты»).

Зайцаў Г. Н., Коласаў А. М., Даўгуль К. Я., Школьнік М. І., Белазёраў П. В. (калектыву КПБ «Чырвоны мэталісты»), Бачкоў І. П. (яч. КПБ спажывецсаюзу), Вікенцьцеў Н. П., Елісееў П. Х., Клюса М. І., Сарак М. А., Індрушонак І. В., Дужы Н. М., Мухін В. К., Кісьцянёў П. Е. (МББ чыг.).

Пераведзены з кандыдатаў у сапраўдныя члены:

Фіала А. (к-ву КПБ «Чырвоны мэталісты»).

Калі у каго маюцца зьвесткі, характарызуючыя вышэйпамянёных таварышоў, як немагчымых быць у партыі, паведамеце 2-гі райком КПБ (Вакзальная, 41), у 3-х дзённы тэрмін са дню абвесткі.

КУРСЫ АБЛІГАЦЫІ ДЗЯРЖ. ПАЗЫК

Сёньня аддзяленьне дзяржбанку і ўсе грашовыя ўстановы і ашчадкасы прадаюць купляюць аблігацыі дзяржпазык па наступным цэнам:

Каштоўныя паперы	Пануюць	Прадаюць
1-я 6% паз. індустр. 1927 г. за абл. у 25 р.	25—62½	25—72½
2-я паз. індустр. 1928 г. прац.	26—00½	26—10½
2-я паз. індустр. 1928 г. беспрац.	25—63	25—73
3-я паз. індустр. 1929 г. прац. за абл. у 50 р.	—	51—30
3-я паз. індустр. 1929 г. беспр. за абл. у 50 р.	—	
Паз. узмацн. сял.-гасп. за абл. 10 р.	10—10½	10—50½
Беспрац. выйгр. пазыка 1926 г. за абл. 100 р.	130—45	132—45
Беспрац. выйгр. пазыка 1929 г. за абл. 100 р.	101—35	101—75
10% выйгр. паз. 1927 г. за абл. у 25 р.	26—34	—
3-я сял. паз. 1927 г. за абл. у 5 р.	5—00	5—02
12% рэнт. паз. 1927 г. за абл. у 100 р.	—	—
11% унутр. паз. 1928 г. за абл. у 100 р.	105—32	105—37
1-я 6% выйгр. паз. 1922 г. за абл. у 5 р.	4—90½	—
Моссавет	25—14	25—24
Ун. 9 выйгрыш. 1930 г.	50 20	50—40

6-га сьнежня 1929 г.

Час. вык. аб. рэдакт. **Я. Рубінштэйн.**

Кіно „МАСТАЦКІ".

Апошні 2 дні: 22 і 23 лютага, нямецкі БАЯВІК вытворчасьць „УФА-ФІЛЬМ" 1929 г.

ВІНАВАТЫ

(СУДОВАЯ ПАМЫЛКА)

Рэжысэр Іоганэс МЭЙЭР.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

№ 37—вядомы артыст **Бернард ГЕТКЕ.**

Магда жонка № 37—швэд. арт. **ХАСЕЛЕНВІСТ.**

Марыя дачка № 37— **Сюзі ВЕРНОН.**

Права абаронца Пэтэрс—першы раз у СССР—**Вілі ФРЫТЦ.**

СЭАНСА 4 СЭАНСА

Пачатак 1-га сэансу а 5 г. — хв.
„ 2-га „ „ 6 г. 50 хв.
„ 3-га „ „ 8 г. 40 хв.
„ 4-га „ „ 10 г. 30 хв.

Каса адчынена з 4 гадзін.

Кінотэатр „СПАРТАК".

3 панядзелка, 24-га лютага,

ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКАГА ТЭАТРУ **ЛІЛІПУТАЎ**

пад кіраўніцтвам Б. Ф. Малікоўскага, пры ўдзеле артыстаў: Т. Лясной, Н. Сьвятлова, Ж. Калібры, М. Лютбімава, М. Арнольдзі, І. Мартава, І. Дузь, Н. Юрчанка, І. Ражкоўскага і В. Вальдэмарана.

У ПРАГРАМЕ: музыка, сьпевы, апавяданьні, частушкі, злоба дню, гумар, сатыра, розныя танцы, клёўнада і балет.

Уласная вопратка, парыкі, рэквізіт, мэблі.

Упаўнаважаны В. Майзель.

НА ЭКРАНЕ:

Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Тэрра Фільм" **НУРЫ**

Пастаноўка рэжысэра Генры Стуарт.

Пачатак 1-га сэансу а 5 гадз.

694—3—2

Об'явление

Витебская **СТРАХКАССА** объявляет **КОНКУРС** на **ВРАЧА-КОНСУЛЬТАНТА** для временной работы сроком на 3 месяца.

Об условиях узнать в страхкассе ком. № 2.

Зав. Фельдман.

Секретарь Щамель.

603—4—1

ПРОДАЕТСЯ

спешно за отъездом **РАЗНАЯ МЕБЕЛЬ** по Верхне-Петровской ул. 43. Смотреть от 3-х до 5-ти час.

ТЕАТР (Смоленская ул.)

Мастацкі кіраўнік **Міron Барскі**

РАСЕЙСКАЯ ДРАМА

пад кіраўніцтвам **Я. Б. Скальскага**

У нядзелю, 23 лют., п'еса М. Волахава

САККА І ВАНДЭЦЦІ ў 11 малюнк.

Балеты прадаюцца ў касе тэатра

Анонс! Рыхтуецца да пастаноўкі: **ГОРА АД РОЗУМУ».**

„БЕЛДЗЯРЖКІНО". 3 панядзелка, 17-га лютага.

СПАРТАК Пачатак 1-га сэан. а 5 г. 15 хв.

Мастацкі Пачатак 1-га сэансу а 5½ г.

ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 5½ г. Кас. адч. з 4 г.

Толькі 2 дні **РАЗЛОМ**

ВІНАВАТЫ (СУДОВАЯ ПАМЫЛКА)

МОАНА (Сын паўднёвага мора) у 7-мі частках.

ЦЫРК Таварыства „Прыхільнікі дзяцей".

Сёньня, 22-га лютага, **ПРАЦЯГ ГАСТРОЛЯЙ** лепшых сатырыкаў Рэспублікі, прайш. з вялізарнейшым посьпехам,—

ГРОМАВА І МІЛІЧА ў зусім новым рэпэртуары.

Выключная праграма пры ўдзеле ўсіх цыркавых атракцыёнаў

Пачатак а 8½ гадзіне ўвечары

АНОНС: у нядзелю, 23 лютага, **дзіцячае дзённае прадстаўленьне**

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі

Па гораду

Інвал. кн. № 2328 Н. М. Шыфрына 2031

Сябр. кн. саюзу чыг. В. Ф. Багданава 2032

Пасьв. асаб. В. К. Камоска 2033

Сяр. кн. саюзу тэкст і проп. панч. ф. М. А. Зайцавай 2043

С я б р. кн. ТПО № 3086 В. Н. Берзіна 2034

Ваен. кн. І. Д. Савіцкага 2036

Кн. Храпав. спаж.-т-ва К. П. Анішчанка 2037

Пасьв. асаб. К. В. Канцавога 2040

Квіт. лёмб. № 16976 Ф. А. Крэйс 2041

Кн. каап. «Змычка» Х. Е. Шалаева 2042

Сябр. кн саюзу тэкст і проп. панч. ф. М. А. Зайцавай 2043

Витебскому Отделению **„БЕЛМЯСО"**

ТРЕБУЕТСЯ

ИНЖЕНЕР ИЛИ ТЕХНИК

для руководства строительными работами.

Оплата по соглашению.

С предложением обращаться в контору витебской скотобойни, телефон № 1-35.

Администрация.

598—1—1

К скому авиопарку

СРОЧНО ТРЕБУЮТСЯ ДВА ПОЛОТЕРА.

Условия—на месте.

Пом. ком. парка **Бескишкин.**

585—3—2

Плата за опубликование об утере одного документа 75 к.

Вітгарніт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10.